Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 76 (5750) | 2 красавіка 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Цяпер, я думаю, ясна для ўсіх, што цяперашнія шкоднікі і дыверсанты, якім-бы сцягам яны ні маскіраваліся, трацкісцкім ці бухарынскім, даўно ўжо перасталі быць палітычнай плынню ў рабочым руху, што яны ператварыліся ў беспрынцыпную і безыдэйную банду прафесіянальных шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў, забойцаў. Зразумела, што гэтых паноў прыдзецца граміць і карчаваць бязлітасна, як ворагаў рабочага класа, як здраднікаў нашай радзіме".

(З заключнага слова таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б) 5 сакавіка 1937 г.)

Большэвіцкая праверка і загартоўка кадраў

Сёння мы друкуем заключнае слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б).*)

Узначаліць палітычны паварот у жыцці краіны, ператварыцца ў непрыступную крэпасць, куды не можа пранікнуць ні адзін двурушнік — такавы жаронныя задачы, якія стаяць перад нашай партыяй. Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) указваюць шлях да выканання гэтых задач. Даклад і заключнае слова таварыша Сталіна, з большэвіцкай праматой і бясстрашнасцю раскрываюць недахопы партыйна-палітычнай работы, узбройваюць партыю цвёрдым веданнем мэты і сродкаў да яе дасягнення.

Вялікая сіла большэвізма заўсёды заключалася ва ўмённі знайсці чарговае звяно, ухапіўшыся за якое можна выцягнуць увесь ланцуг чарговых задач. На кожным паваротным пункце гісторыі партыя высоўвала той або іншы асноўны лозунг, які ярка асвятляў усю складаную абстаноўку. Авалодаць большэвізмам, палітычна выхаваць кадры, па-большэвіцку загартаваць іх — такава важнейшая задача пяперашняга перыяда.

Кадры — адна з асноўных праблем пабудовы социялізма. Яшчэ задоўга да перамогі Вялікай пролетарскай революцыі гэта прадбачылі Маркс і Энгельс. На няхватку кадраў, на іх нявопытнасць і наўмеласць ставілі стаўку незлічоныя ворагі рабочага класа. Але яны жорстка пралічыліся. Вопыт революцыі паказаў, што працоўныя масы, вызваліўшыся ад эксплаататараў, з небывалай быстрынёй высоўваюць мноства таленавітых і адданых кіраўнікоў. Узброеныя глыбокай верай у творчыя сілы мас, Ленін і Сталін заўсёды аддавалі выключную ўвагу пытанню аб кадрах, іх падбору, падрыхтоўцы, праверцы.

Нам патрэбны кадры праверанныя, адточаныя ў барацьбе, кадры, уладаючыя большэвіцкай зоркасцю, непрыміримасцю да ворага. Наяўнасць такіх кадраў — абавязковая ўмова далейшых перамог, бо барацьба з ворагамі далёка не закончана.

Як могуць, напрыклад, дзейнічаць япона-нямецка-трацкісцкія шкоднікі, шпіёны, дыверсанты, забойцы ў абстаноўцы непадзельнага давер'я працоўных мас да нашай партыі? Гэтыя мярзаўцы карыстаюцца палітычнай блізарукасцю і слепатой многіх нашых работнікаў, яшчэ не выкараненай сярод іх ідыёцкай хваробаю — бясклопатнасцю, гатоўнасцю пачуць на лаўрах дасягнутых поспехаў, дабрадушнасцю і самазадавальненнем. Частка работнікаў схільна была пазабыць такі непрыемны факт, як капіталістычнае акружэнне. Многія не зразумелі таго, што трацкізм ужо даўно з палітычнай плыні ў рабочым класе ператварыўся ў агульную банду разбойнікаў з вялікай дарогі, арудуючых на службе япона-нямецкай паліцэйскай аховранкі. Вузкалобае дзяляцтва, забыццё партыйна-палітычнай работы, падхалімаж, зазнайства раду нашых работнікаў — такавы парокі, якія на-руку толькі ворагам.

Рашуча, па-большэвіцку разделаца з гэтымі буйнейшымі недахопамі — значыць нанесці руйнуючы ўдар усім ворагам, унутраным і знешнім.

Паставіць партыйна-палітычную работу ў цэнтр увагі партыйных арганізацый — зусім не значыць аддаць забыццю гаспадарчыя задачы. «Нельга шарахацца ад адной крайнасці да другой. Нельга аддзяляць палітыку ад гаспадаркі. Мы не можам уйсці ад гаспадаркі, таксама, як не можам уйсці ад палітыкі». Метад большэвіцкага кіраўніцтва гаспадарчымі органамі заключаецца ў тым, каб «сістэматычна дапамагаць гэтым органам, сістэматычна ўмацоўваць іх і кіраваць гаспадаркай не паміма гэтых органаў, а праз іх». Пакуль гаспадарчыя органы — і перш за ўсё зямельныя — не ўмацаваны як належыць, партыйныя арганізацыі не могуць ухіліцца нават ад дробязей гаспадарчай работы. Так, напрыклад, прамым злачынствам было-б у гэтыя дні самаўхіленне партыйных арганізацый ад работы па сяўбе.

Большэвізм заўсёды адзначаўся найвялікшай увагай да сваіх кадраў, няўсыпнымі клопатамі аб іх. Скарбніцу большэвіцкага вопыту у гэтым пытанні таварыш Сталін абагаціў сваім дакладам і заключным словам. Жорсткай, але справядлівай крытыцы падверг ён гора-кіраўнікоў, якія забываюць элементарныя правы кожнага члена партыі, ён разграміў бюракратаў, якія за папяровым аркушам не бачаць жывога чалавека, якія прывыклі лічыць тысячамі і не ўмеюць адрозніваць асобных комуністаў. Ён асудзіў практыку няправільных выключэнняў з партыі, якія могуць толькі аказаць услугу ворагу.

Правільна падбіраць кадры — значыць няўхільна кіравацца двума прынцыпамі: палітычным і дзелавым. Забыццё аднаго з гэтых прынцыпаў азначае паўнейшае скажэнне большэвіцкага метаду падбору кадраў. Замена гэтых асноў «прынцыпамі» сямейнасці, кумаўства, якія квітнелі ў радзе арганізацый, азначае здзекванне над лепшымі традыцыямі большэвізма, здзекванне над яго стылем работы.

Таварыш Сталін у заключным слове ўзяў над рэзкую крытыку практыку некаторых партыйных кіраўнікоў у гэтым пытанні. «Узяць, напрыклад, таварышоў Мірзаяна і Вайнова... Гэтыя людзі ў нашым асяроддзі — не апошнія работнікі. А як яны падбіраюць работнікаў? Першы перацягнуў з сабой у Казахстан з Азербайджана і Урала, дзе ён раней працаваў, 30—40 «сваіх» людзей і расставіў іх на адказныя пасты ў Казахстане. Другі перацягнуў з сабой у Яраслаўль з Данбаса, дзе ён раней працаваў, звыш дзесятка таксама «сваіх» людзей і расставіў іх таксама на адказныя пасты. Ёсць, стала быць, свая арцель у таварыша Мірзаяна. Ёсць яна і ў тав. Вайнова».

Відавочна шкода, якая наносіцца падобнай практыкай, людзі, якія пераязджаюць з месца на месца ў «хвасце» свайго кіраўніка, аддзяляюць яго ад мясцовага актыва. «Зразумела, што такая сямейная абстаноўка стварае спрыяючае асяроддзе для вырошчвання падхалімаў, людзей, пазбаўленых пачуцця сваёй годнасці і таму не маючых нічога агульнага з большэвізмам».

Самым лепшым кадры не забяспечаны ад разлажэння, калі не правяраць іх на рабоце сістэматычна, штодзённа. Праверка гэта ўладае поўнай дзейснасцю толькі ў тым выпадку, калі яна ажыццяўляецца не толькі зверху, з боку кіруючых вышэйшых органаў але і знізу, з боку мас. Рэгулярныя сходы актыва наркаматаў, кіраўніцтваў, глаўкаў, прадпрыемстваў заклікаюць стаць сапраўднай трыбунай большэвіцкай самакрытыкі, бічуючай усе недахопы работы і асобных работнікаў, не гледзячы на асобы, на ранейшыя заслугі. Ужо першыя вопыты склікання актываў паказалі жыццёвасць і сілу гэтай формы кантролю і праверкі кадраў знізу. Закрытыя выбары партыйных органаў на аснове строгага выканання ўказанняў Цэнтральнага Камітэта нашай партыі — самы дзейсны метад праверкі знізу кадраў партыйных кіраўнікоў.

На растлумачэнні дапушчаных памылак выхоўваюцца кадры. Замаваць памылкі работніка — значыць нашкодзіць яго ў канчатковым выніку. Агонь большэвіцкай самакрытыкі выпальвае ўсё гніляе, загартоўвае ўсё здаровае. Абывательскі і мяшчанскі прынцып — «жыві і жыць давай другім» — азначае не шкадаваць кадры, а штурхаць іх на шлях самаздавальнення і загнівання. Колькі работнікаў можна было-б захаваць, калі-б партыйныя кіраўнікі і арганізацыі заўсёды з сапраўднай большэвіцкай праматой і запалам бралі пад абстрэл усе іх памылкі і недахопы, пачынаючы з самых «маленькіх»!

Кіруючы склад нашай партыі — яе генералітэт, яе афіцэрства, яе унцер-афіцэрства — узначальвае армію, якой ніколі не бачыў свет. Гэта—перамогшая вялікая армія працы, узняўшая на адной шостай часткі зямнога шара чырвоны сцяг суветнага комунізма. Сіла большэвіцкіх кадраў — у іх уменні не толькі вучыць масы, але і вучыцца ў іх. На яркіх і пераканаўчых прыкладах таварыш Сталін паказаў, якую гіганцкую дапамогу партыі аказваюць вопыт і веды «маленькіх людзей».

Наша партыя нястомна будзе каваць кадры, не ведаючыя страху ў барацьбе, ласканала валодаючыя большэвізмам, кадры, здольныя быць сапраўднымі кіраўнікамі мільёнаў.

(Перадавы артыкул «Праўды» ад 1 красавіка).

*) Заключнае слова тав. Сталіна надрукавана ў газ. «Звязда» 1 красавіка.

АБ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАЎКАХ ЗЯРНА ДЗЯРЖАВЕ У 1937 годзе КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ І АБ СТАЎКАХ НАТУРАПЛАТЫ РАБОТ МТС

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

I

АБ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАЎКАХ

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20 сакавіка 1937 года «Аб абавязковых пастаўках зярна, рыса, сланечніка і бульбы дзяржаве ў 1937 годзе калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі і аб стаўках натураплаты работ МТС», пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20 сакавіка 1937 года «Аб памяншэнні нормы здачы зярна і бульбы калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі па БССР, Калінінскай, Ленінградскай, Вінніцкай і Кіеўскай абласцях» і загаду Камітэта загатовак пры СНК СССР ад 28 сакавіка 1937 года — Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Захаваць па абавязковых пастаўках на 1937 год дзейнічаўшыя ў 1936 годзе парадак, тэрміны і пераўтвораныя нормы здачы зярна дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, як сяроднія па ўсіх зернавых культурах, так і паасобна па жыту, пшаніцы і бабовых, за выключэннем змен, устаноўленых п. 2 гэтай пастановы.

2. Знізіць на 0,30 цнт. супроць дзейнічаўшых у 1936 годзе сяроднія нормы здачы зярна калгасамі як абслугоўваемымі МТС, так і не абслугоўваемымі МТС і ўстанавіць на 1937 год наступныя зацверджаныя Камітэтам СНК СССР нормы здачы зярна як сяроднія па ўсіх зернавых культурах, так паасобна па жыту, пшаніцы і бабовых для наступных раёнаў:

(у цэнт. з 1 га плана севу)

	КАЛГАСЫ АБСЛУГОЎВАЕМЫЯ МТС				КАЛГАСЫ НЕАБСЛУГОЎВ. МТС			
	Сярэдн. па ўсіх зярнах	У тым ліку			Сярэдн. па ўсіх зярнах	У тым ліку		
		Па жыту	Па пшаніцы	Па бабовых		Па жыту	Па пшаніцы	Па бабовых
1. Вягомльскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,30	0,35	0,10	0,10
2. Лепельскі	0,20	0,20	0,15	0,10	0,50	0,45	0,30	0,20
3. Ушацкі	0,20	0,20	0,20	0,10	0,50	0,45	0,30	0,20
4. Чашніцкі	0,20	0,20	0,15	0,10	0,50	0,40	0,30	0,20
5. Даманавіцкі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,45	0,40	0,30	0,15
6. Ельскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,30	0,30	0,10	0,10
7. Жыткавіцкі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,25	0,35	0,10	0,10
8. Капаткевіцкі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,40	0,30	0,20	0,10
9. Лельчыцкі	0,10	0,10	0,10	0,10	0,25	0,35	0,10	0,10
10. Мозырскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,40	0,40	0,30	0,15
11. Нараўлянскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,30	0,35	0,10	0,10
12. Петрыкаўскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,30	0,30	0,10	0,10
13. Тураўскі	0,10	0,10	0,10	0,10	0,30	0,25	0,10	0,10
14. Асвейскі	0,10	0,10	0,10	0,10	0,25	0,30	0,10	0,10
15. Ветрынскі	0,20	0,20	0,20	0,10	0,55	0,45	0,30	0,20
16. Дрысенскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,35	0,35	0,20	0,15
17. Полацкі	0,20	0,20	0,20	0,10	0,50	0,45	0,30	0,20
18. Расонскі	0,15	0,15	0,20	0,10	0,40	0,45	0,40	0,15
19. Грэскі	0,25	0,25	0,30	0,15	0,60	0,50	0,35	0,25
20. Копыльскі	0,30	0,30	0,35	0,20	0,65	0,65	0,45	0,30
21. Любаньскі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,45	0,35	0,25	0,15
22. Слуцкі	0,30	0,30	0,35	0,20	0,70	0,65	0,45	0,30
23. Старобінскі	0,20	0,20	0,25	0,10	0,45	0,45	0,35	0,25
24. Чырвонаслабодскі	0,30	0,30	0,35	0,20	0,65	0,65	0,45	0,30
25. Дзяржынскі	0,25	0,25	0,25	0,15	0,50	0,50	0,30	0,20
26. Заслаўскі	0,20	0,20	0,15	0,10	0,50	0,50	0,30	0,20
27. Лагойскі	0,20	0,20	0,15	0,10	0,50	0,45	0,30	0,20
28. Плешчаніцкі	0,15	0,15	0,10	0,10	0,35	0,35	0,20	0,10
29. Уадзенскі	0,15	0,15	0,20	0,10	0,40	0,45	0,20	0,15

3. Захаваць на 1937 год дзейнічаўшыя ў 1936 годзе дзве дыферэнцыраваныя нормы здачы зярна для калгасаў у наступных раёнах:

1. Аршанскім
2. Бабруйскім
3. Барысаўскім
4. Кармянскім
5. Пухавіцкім
6. Суражскім
7. Чэрвеньскім
8. Бешанковіцкім
9. Хойніцкім
10. Глускім
11. Лагойскім
12. Сіроцінскім
13. Уваравіцкім
14. Чэрыкаўскім
15. Брагінскім
16. Веткаўскім
17. Дубровенскім
18. Парыцкім
19. Смалявіцкім
20. Чырвонапольскім

4. У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20 сакавіка 1937 года забараніць прымяненне грашовых штрафаў калгасам, не выканаўшым ва ўстаноўленыя тэрміны сваіх абавязацельстваў па здачы зярна дзяржаве.

Устанавіць, што за злоснае невыкананне калгасам да ўстаноўленага тэрміну абавязацельстваў па здачы зярна пракурор рэспублікі па прадстаўленню раённага ўпаўнаважанага Камітэта загатовак прымявае праўленне калгаса да адказнасці па суду для накладання грашовага штрафу ў размеры каштоўнасці нададзенай часткі зярна, вылічанай па дзяржаўных закупачных цэнах, а таксама для спагнання натурай недавыкананай часткі паставак зярна.

II

ПА НАТУРАПЛАЦЕ РАБОТ МТС

5. Знізіць дзейнічаючыя стаўкі натураплаты работы МТС, праведзеных у калгасах пад ураджай 1937 года, і ўстанавіць па пералічаных ніжэй работах наступныя стаўкі натураплаты работ МТС:

	Па зернавых культурах і сланечніку (у кгр). Менш 3 цнт.	3—менш 5	5—менш 7	7—менш 9	9—менш 11	11—менш 13	13 і вышэй
1. Веснаўспашка	9	22	55	70	90	100	130
2. Уздым папараў і зяблева	8	20	42	60	80	— 100	120
3. Пасеў	2	4	8	12	16	20	25

4. Малацьба — 7 проц. ад колькасці зярна, намалочанага малатарнямі МТС.
5. Баранаванне ў адзін след 0,5 1, 1,5 2 3 4 5
6. Уборка камбайнамі — 9 проц. ад колькасці зярна, намалочанага камбайнамі.

Ураджай з аднаго гектара (у цнт.)						
7. За правядзенне ўсяго комплекса асноўных с-г. работ:						
а) пры абмалоце зярна малатарнямі (уздым папараў ці зяблева, пасеў, уборка, малацьба) і 7 проц.	13 30	55	80	105	130	170
б) пры ўборцы зярна камбайнамі (уздым папараў ці зяблева, пасеў, уборка камбайнамі) і 9 проц.	9 20	37	54	71	88	128

ад зярна, намалочанага малатарнямі МТС.

ад зярна, намалочанага камбайнамі МТС.

Устанавіць, што за правядзенне другой, трэцяй і чацвертай культывацыі стаўкі натураплаты работ МТС, устаноўленыя за правядзенне культывацыі, зніжаюцца: па другой культывацыі — на 10 проц., па трэцяй культывацыі — на 20 проц., па чацвертай культывацыі — на 30 проц.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б В. ШАРАНГОВІЧ.

Дэлегаты, ўсебеларускай нарады стаханаўцаў—перадавікоў сельскай гаспадаркі. НА ЗДЫМКУ (злева направа): ордэнаносцы — знатныя людзі Совецкай Беларусі тт. Каўдзерка і Селязнёва.
Фото Я. Салавейчыка.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАСЕЎНАЙ—САМАЯ АДКАЗНАЯ ЗАДАЧА КОМУНІСТА ВЁСКІ

Да разгортвання веснавой пасеўнай кампаніі асталіся лічаныя дні. А між тым з падрыхтоўкай да выхаду ў поле вельмі трывожнае становішча па нашай рэспубліцы. У пастанове Соўнаркома БССР і ЦК КП(б)Б, якая была змешчана ў нумары «Звязды» за 30 сакавіка, указана, што падрыхтоўка да пасеўнай «у большасці акруг і раёнаў прадастаўлена самацёку, што сведчыць аб самаўхіленні кіраўніцтва гэтых акруг і раёнаў ад важнейшай у жыцці рэспублікі работы».

Самазаспакоенасць, самацёк у рабоце прывялі да таго, што рад раёнаў рэспублікі не гатоў яшчэ выйсці ў поле. Горш за ўсё што і зараз нават няма ў кіраўнікоў раёнаў і кіраўнікоў Наркомзема патрэбных клопатаў аб сяўбе, патрэбнай перабудовы сваёй работы з тым, каб навярстаць упушчанае. У большасці акруг і раёнаў у кіруючых работнікаў адсутнічае цвярозы ўлік недахопаў і цяжкасцей падрыхтоўкі да сяўбы, няма большэвіцкай мабілізаванасці на перамаганне гэтых цяжкасцей і ўмення мабілізаваць усе ўнутраныя рэзервы раёна, калгаса, МТС, соўгаса.

Асабліва недапушчальна адстаюць у падрыхтоўцы да сяўбы па ўсіх галоўнейшых паказальніках Мозырская акруга (сакратары АК тт. Ананьеў, Раманенка, старшыня акрвыканкома т. Дубіна), Полацкая акруга (сакратары АК тт. Ліхачоў і Вайновіч, старшыня акрвыканкома тав. Свірыдзў), раёны Мсціслаўскі (сакратар РК т. Штэйнгарт, старшыня РВК тав. Рай), Асвейскі (сакратар РК т. Капуба, старшыня РВК т. Мартынаў), Расонскі (сакратар РК т. Фрыдзон, старшыня РВК т. Партноў), Кіраўскі (сакратар РК тав. Вільчак, старшыня РВК т. Касцюк) і інш.

Галоўнае зараз—падрыхтоўка да пасеўнай. Рашаючымі ўчасткамі падрыхтоўкі да пасеўнай з'яўляюцца — засыпка, праверка і абмен насення, вывазка ўгнаенняў і падрыхтоўка цягавай сілы. Становішча з насенным фондам унушае яўную трывогу. Замест таго, каб мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы і перамагчы ўтрымаўчыя настроі, некаторыя кіраўнікі раёнаў самі хварэюць гэтым, спадзяючыся, што ім адкульсьці прышлюць насенне. Вось, напрыклад, Ветрынскі раён (старшыня РВК тав. Харытоненка, сакратар РК тав. Плоткін). Тут на 25 сакавіка засыпана зернавых культур на 83,7 проц., у Багушэўскім раёне (старшыня РВК т. Еўдасеў, сакратар райкома т. Мяжуеў) засыпана на 78,9 проц. За пяцідзенку прырост па засыпцы насенных фондаў па гэтых раёнах складае ўсяго толькі ад 1 да 3 проц.

Не прыходзіцца даказваць, што велізарнейшае значэнне ў павышэнні ўраджайнасці мае гатунковае насенне. Згодна плана па БССР у гэтым годзе павінна быць засеяна чыстагатунковым насеннем 457.900 гектараў. А абмен насення праходзіць надзвычай дрэнна. На 25 сакавіка па рэспубліцы дзяржаўны гатункаабмен праведзен усяго на 42,1 проц., міжкалгасны гатункаабмен на 32,7 проц.

Ва многіх раёнах ігнаруюцца прамыя ўказанні ЦК і Соўнаркома па пытанню аб ўгнаенні. Па Кіраўскаму раёну (старшыня РВК тав. Касцюк, сакратар РК КП(б)Б тав. Вільчак) вывезена гною на поле ўсяго 9,7 проц., Смілавіцкаму (старшыня РВК тав. Жукоўскі, сакратар РК КП(б)Б тав. Плятнёў) — 8,4 проц., Перахоўскаму (старшыня РВК тав. Белякоў, сакратар РК КП(б)Б т. Кечкін) — 7,0 проц., Брагінскаму (старшыня РВК т. Баброў, сакратар РК КП(б)Б т. Сердзюкоў) — 6 проц.

Аб падрыхтоўцы каня да пасеўнай таксама яшчэ мала думаюць. У тых-жа Багушэўскім, Ветрынскім, Смілавіцкім і іншых раёнах, нямала ёсць калгасаў, дзе няма належнага догляду за канём, часта мяняюцца конюхі, на канюшнях панае абязлічка.

Дрэнна падрыхтаваны да сяўбы і соўгасы нашай рэспублікі. Трэба ўсё зрабіць, каб соўгасы сустрэлі вясну ўзброенымі, каб яны былі прыкладам для калгасаў рэспублікі.

ЦК і Соўнарком абавязалі акруткомы і райкомы партыі, старшынь акрвыканкомаў і райвыканкомаў не пазней 5 красавіка закончыць засыпку насення, правесці міжкалгасны гатунковы абмен, закончыць па ўсіх МТС прыёмку трактароў, закончыць заключэнне дагавораў МТС з калгасамі. Да 5 красавіка МТС павінны закончыць складанне вытворчых планаў калгасаў і разгарнуць арганізацыю і падрыхтоўку брыгад і звенняў да палявых работ.

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, дырэктары МТС, загадчыкі райзямадзелаў, Наркомзем павінны прыняць усе меры к таму, каб гэта ўказанне ЦК і СНК было цалкам і поўнасцю выканана. Трэба мабілізаваць калгасны актыў і ўсіх калгаснікаў на хутчэйшую ліквідацыю прарыву ў падрыхтоўцы да выхаду ў поле, на паспяховае правядзенне сяўбы.

Многія раённыя камітэты партыі не зразумелі таго, што паварот да партыйна-палітычнай работы ні ў якім разе не азначае адмаўлення партыйных органаў ад кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. «Сэнс вядомага пункта рэзалюцыі аб вызваленні партыйных арганізацый ад гаспадарчых дробязей і ўзмацненне партыйна-палітычнай работы заключаецца, — гаворыць таварыш Сталін, — не ў тым, каб адыйсці ад гаспадарчай работы і гаспадарчага кіраўніцтва, а ўсяго толькі ў тым, каб не дапускаць больш практыкі падмены і абязлічання гаспадарчых органаў, у тым ліку і асабліва зямельных органаў, напымі партыйнымі арганізацыямі. Неабходна, стала быць, усвоіць метад большэвіцкага кіраўніцтва гаспадарчымі органамі, які заключаецца ў тым, каб сістэматычна дапамагаць гэтым органам, сістэматычна ўмацоўваць іх і кіраваць гаспадаркай не паміма гэтых органаў, а праз іх. Трэба даць гаспадарчым органам і перш за ўсё зямельным органам лепшых людзей, трэба ўкамплектаваць гэтыя органы асноўнымі лепшымі работнікамі, здольнымі выконваць усклаўленыя на іх задачы. Толькі пасля таго, як будзе праароблена гэта работа, можна будзе разлічваць на тое, што партыйныя арганізацыі будуць поўнасцю вызвалены ад гаспадарчых дробязей. Зразумела, што справа гэта сур'ёзная і патрабуе вядомага часу. Але пакуль гэта не зроблена, партыйным арганізацыям прыдзецца і ў далейшым, на пэўна кароткі тэрмін, займацца ўшчыльную сельскагаспадарчымі справамі з усімі іх дробязямі, ворывам, сяўбой, уборкай і т. д.».

Гэтага не зразумелі кіраўнікі партыйных арганізацый, шарахнуліся ў другую крайнасць, забыўшы, што сяўба — важнейшая гаспадарчая кампанія ў краіне, за паспяховае правядзенне якой перад краінай адказвае перш за ўсё партыйная арганізацыя.

Аднак адсюль зусім не вынікае, што Наркомзем БССР і яго органы на мясцах могуць і надалей быць у ролі наглядальнікаў і рэгістратараў. Пара буквальна сваю работу так, каб вучыць свае кадры поўнасцю адказваць за правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ. Неадкладна Наркомзем павінен змяніць метады свайго кіраўніцтва падрыхтоўкай пасеўнай кампаніі ў калгасах і ў аднаасобнікаў. Аграномы павінны быць зараз на раёне, у калгасах. Трэба дапамагчы калгасам як найлепш падрыхтаваць глебу і насенне, як найлепш правесці ўсе агратэхнічныя мерапрыемствы з тым, каб дабіцца ў гэтым годзе высокага ўраджаю.

Трэба нанесці рашучы ўдар самазаспакоенасці і розным разважанням аб тым, што сяўба пройдзе сама сабой. Самацёкам пасеўная кампанія не будзе праведзена.

Сяўбу трэба арганізаваць.

Кожная раённая партарганізацыя, кожны вясковы комуніст павінны памятаць, што няма зараз важнейшай і адказнейшай задачы на вёсцы, як падрыхтоўка да правядзення веснавой пасеўнай кампаніі.

ПРЫЕМ У ГОНАР ФРАНЦУЗСКАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

МАСКВА, 1 красавіка. (БЕЛТА). 31 сакавіка народны камісар аховы здароўя СССР тав. Г. Н. Камінскі наладзіў прыём у гонар французскай медыцынскай дэлегацыі, якая знаходзіцца ў Маскве.

На прыёме прысутнічалі: французская медыцынская дэлегацыя ў поўным складзе на чале з таварышам міністра аховы здароўя Францыі п. П'ерам Дэзарно, народны камісар па замежных справах тав. М. М. Літвінаў, нам. наркома замежных спраў тав. Б. С. Стаманякоў, саветнік французскага пасольства п. Пайяр, нарком аховы здароўя РСФСР тав. П. Г. Сергіеў, народны камісар асветы тав. А. С. Бубноў і шматлікія прадстаўнікі совецкай медыцыны, грамадскасці і друку.

За вячэраю тав. Камінскі звярнуўся да французскай дэлегацыі з прывітальнай прамовай.

У адказным слове п. Дэзарно ад імя французскай навуковай дэлегацыі і французскага ўрада выказаў падзяку за бліскучы сяброўскі прыём, аказаны дэлегацыі ў Маскве.

Рускія белагвардзейцы на службе ў фашыстаў

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» паведамляе, што ў апошні час ва Францыі арыштован рад белагвардзейцаў па абвінавачанню ў шпіянажы на карысць Германіі. Газета ўказвае, што блізкія памочнікі белагвардзейскага генерала Мілера — генералы Фок і Шынкарэнка і капітаны Крывашэін і Паўлушын служаць у арміі Франко.

«Юманітэ» патрабуе тэрмінова расследвання дзейнасці рускіх белагвардзейцаў ва Францыі ў карысць замежнага фашызма і пазбаўлення іх магчымасці наносіць у далейшым шкоду Францыі.

У ГЭТЫМ-ЖА ДУХУ

ГЕРМАНСКІ ДРУК АБ РОСПУСКУ ЯПОНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

БЕРЛІН. (сталіца Германіі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Роспуск японскага парламента прыцягвае сур'ёзную ўвагу германскага друку. Газеты адзначаюць «нечаканасць» роспуску.

Як указвае германскае інфармацыйнае бюро, трэба чакаць, што «японскі ўрад сам умяшаецца ў выбарчую кампанію і напрабуе, у прыватнасці, стварыць новую ўрадавую партыю. Але поспех гэтага, паводле слоў бюро, няпэўны». «Адзіным выхадам,—заяўляе германскае інфармацыйнае бюро.—з'явіцца адстаўка габінета Хаясі і назначэнне новага незалежнага габінета».

У гэтым-жа духу каментуе падзеі газета «Дэйчэ альгемейне цэйтунг». Германскі друк адкрыта заклікае Японію ліквідаваць астаткі парламентарызма і ўстанавіць фашысцкую дыктатуру.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Аб выніках Пленума ЦК ВКП(б)

З РЭЗАЛЮЦЫІ АКТЫВА ВІЦЕБСКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б ПА ДАКЛАДУ ТАВ. ШУСЦІНА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад т. Шусціна аб выніках Пленума ЦК ВКП(б), сход партыйнага актыва віцебскай партыйнай арганізацыі ў колькасці тысячы чалавек поўнасцю ўхваляе рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і патрабуе ад кожнай партарганізацыі, кожнага комуніста няўхільнага правядзення іх у жыццё.

Сход партыйнага актыва лічыць, што ўсе гэтыя сур'ёзныя недахопы ў рабоце, якія ўскрыты Пленумам ЦК ВКП(б), яшчэ ў большай меры адносяцца да нашай віцебскай партыйнай арганізацыі.

ЦК ВКП(б) у сваім рашэнні ад 15 лістапада 1936 г. указаў на нездавальняючую работу Віцебскага гаркома, на дрэнную яго сувязь з пярвічнымі парт-арганізацыямі, на неканкрэтнасць кіраўніцтва з боку гаркома пярвічнымі парт-арганізацыямі.

Сход партактыва лічыць, што зацвярджаная Пленумам ЦК ВКП(б) практыка парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма і статута партыі: казнтацыя, адсутнасць справаздачнасці перад партыйнымі масамі, назначэнства, захапленне гаспадарчай работай, нездавальняючая работа па выхаванню падбору кадраў, адсутнасць сапраўды большэвіцкай выхаваўчай работы, зусім нездавальняючае становішча ў партыйнай арганізацыі крытыкі і самакрытыкі — характарызуе становішча нашай партыйнай арганізацыі і прывялі гарком партыі да адрыву ад партарганізацый, на што зусім правільна ўказаў ЦК ВКП(б) у сваім рашэнні.

Бескантрольнасць у рабоце гаркома партыі, партыйных камітэтаў і парторгаў і зусім недастатковае разгортванне крытыкі і самакрытыкі ў партыйнай арганізацыі стварылі атмасферу самазаспакоєння, дабрадушнасці, падхалімства, узаемаўсхвалення, сямейственасці.

Пленумы гаркома і сходы актыва з сродку крытыкі нашых недахопаў і самакрытыкі партыйных кіраўнікоў ператварыліся ў арэну пустых парадаў, выхвальных маніфестацый аб поспехах, што наносіла велізарную шкоду нашай партыйнай арганізацыі, тармазіла рост актыўнасці членаў партыі.

Гэтыя сур'ёзныя недахопы ў рабоце і наяўнасць у партарганізацыі момантаў падхалімства, ваяўдзізма, бюракратычных метадаў кіраўніцтва з боку гаркома, нячулых адносін да членаў партыі і несвоечасовае рэагаванне на сігналы комуністаў — прывяло да аслаблення пільнасці ў партарганізацыі. Закончыўшы праверку і абмен партыйных дакументаў, віцебская партыйная арганізацыя самазаспакоілася, забыўшы неаднаразовыя папярэджанні ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна аб неабходнасці ўсямернага павышэння рэвалюцыйнай пільнасці і далейшага выкрыцця контррэвалюцыйных варожых элементаў. Гэта прывяло да таго, што контррэвалюцыйныя трацкісцкія шкодніцкія элементы доўгі час пад носам гаркома беспакарана праводзілі шкодніцкую, дыверсійную работу ў паасобных звенніх нашай партыйнай арганізацыі (дэпо, музей, педінстытут і т. д.).

Актыў віцебскай партыйнай арганізацыі лічыць, што ЦК КП(б)Б у практыцы свайго кіраўніцтва недаацэньваў горад, як базу для партыйна-палітычнай работы і выкаўкі большэвіцкіх кадраў.

Актыў ухваляе рашэнне бюро ЦК КП(б)Б ад 19 сакавіка г.г. аб тым, што перадавы артыкул «Звязды» ад 8 лютага г.г. культывуе варожыя большэвізму і асуджаныя партыяй падхалімства і ўгодніцтва, якія, як правільна ўказвае «Правда», «глыбока ўмацаваліся ў беларускай партыйнай арганізацыі».

Сход актыва поўнасцю ўхваляе рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні з партыі подлых здрадніка́ў справы сацыялістычнай рэвалюцыі Бухарына і Рыкава за іх контррэвалюцыйную работу, накіраваную на рэстаўрацыю капіталізма ў нашай краіне і аднаўленне ўлады буржуазіі.

Будзем памятаць, што мы жывем ва ўмовах капіталістычнага акружэння, у пагранічных умовах, што буржуазія беспераперыўна засылае і будзе засылаць да нас сваіх шпіёнаў дыверсантаў і таму рэвалюцыйная пільнасць — асноўная якасць, якая неабходна асабліва зараз большэвіку.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта партыі на чале з тав. Сталіным наша краіна атрымала рашаючыя перамогі ў барацьбе за комунізм і пабудавала сацыялістычнае грамадства. Авалодаўшы большэвізмам пад кіраўніцтвам ЦК партыі мы пойдзем да новых перамог за комунізм.

Група рабочых штамповачнага цэха менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча ў часе абедзенага перапынку слухаюць чытку даклада таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б). Фото Дубаўца (БСФ).

ШКОДНАЯ АДСЯБЯЦІНА І БЛЫТАНІНА

Гомельскі гарком КП(б)Б, замест таго, каб кіраваўца ўказаннямі ЦК ВКП(б) аб парадку выбараў парторганаў, дзе рад сваіх установак, як-та: сакратар ГК тав. Стакун на інструкцыйнай нарадзе сакратароў парткомаў указаў, што «для эканоміі часу галасаваць усе спісы разам, гэта значыць і ў склад парткома і дэлегатаў на партканферэнцыю». Не менш шкодная аказалася ўстаноўка такога парадку: «калі члены партыі пажадаюць, то могуць абрацъ у склад шчотнай камісіі прадстаўніка ГК». Так і атрымалася ў партарганізацыі тэлупчкамбіната, дзе ў часе выбараў членаў шчотнай камісіі выбралі старшынёй шчотнай камісіі прадстаўніка ГК тав. Бугрова, які на ўчоце ў гэтай арганізацыі не лічыцца. Член бюро ГК тав. Бугроў, замест таго, каб растлумачыць комуністам і адказаца ад гэтай прапановы, з заадволеным выглядам даверанай асобы прыняў кіраўніцтва шчотнай камісіяй. Выконваючы абавязкі другога сакратара ГК тав. Гліксон «прыдумаў» пры адкрытым галасаванні галасаваць партбілетамі і не марудзячы ўнёс сваю «геніяльную» прапанову на партсходзе фабрыкі імя Комінтэрна. Усе пытанні адкрытага галасавання на даным сходзе галасавалі партбілетамі. Няма патрэбы даказваць шкоднасць усёй гэтай страшні «асабістых меркаванняў». Ёсць прамыя і чоткія ўказанні ЦК ВКП(б) аб парадку выбараў кіруючых парторганаў, трэба іх строга захоўваць і акуратна выконваць.

В.

СЯМЕЙСТВЕНАСЦЬ І ПАДХАЛІМСТВА ПАНАВАЛА Ў АРГАНІЗАЦЫІ

МОЗЫР. Справаздачны даклад сакратара парткома гандлёвых арганізацый Мозыра тав. Фельдмана насіў вузка дзяляцкі характар. Гэты даклад гаворыць аб тым, што Фельдман нічога не зразумеў ў пастанове Пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава. Адзначыўшы некаторыя «дасягненні» у разгортванні партыйнай работы, дакладчык адразу-ж перайшоў да характарыстыкі работы гандлёвай сеткі. Аб тым-жа, што партком за два гады свайго існавання збіраўся ўсяго чатыры разы, што партыйныя сходы праводзіліся ад выпадку да выпадку, наскокамі, без усякай папярэдняй падрыхтоўкі, што ў парткоме панавала сямейственасць, кругавая парука, радавыя комуністы ў арганізацыі зацяраліся, да іх крытычных выступленняў члены парткома адносіліся з насмешкай, а часамі і проста зацісканні крытыку — дакладчык не сказаў ні слова. Нічога не сказаў ён і аб тым, што на мясакамбінаце, які абслугоўваецца партарганізацыяй, арудавалі жулікі і прайдзісветы, якіх пакрываў сам сакратар парткома.

Аб усім гэтым расказалі ў сваіх выступленнях радавыя комуністы Фрыдман, Гізун, Ліберман, Зайчык і Раманоўск. Яны рэзка крытыкавалі партком і яго сакратара за аларванасць ад мас, за пагардлівыя адносіны да радавых палітычна малапісьменных членаў і кандыдатаў партыі, за грубы заціск крытыкі.

— Калі я выступіў аднаго разу на сходзе рабочых з крытыкай Фельдмана, як дрэннага кіраўніка мясакамбіната,— гаворыць комуніст Ліберман,—то Фельдман узненавідзеў мяне, перастаў са мной гаварыць і стаў арганізоўваць цкаванне мяне з мэтай выжывання з камбіната.

Асабліва жорстка крытыкавалі выступаючыя члена парткома Мебеля, які працуе дырэктарам Белхарчгандля. Гэты заўзяты зажымшчык крытыкі сістэматычна браў курс на выжыванне з сваёй сістэмы комуністаў, акружаючы сябе рознага роду падхалімаў, якія не выносілі з хаты смецця. Аб антыпартыйных паводзінах Мебеля асобныя комуністы гаварылі і раней, але партком не зварачаў на гэта ўвагі. І ўсё таму, што ў парткоме прывыклі жыць у дружбе і вырашаць усе справы па-сямейнаму. Не прыняў партком ніякіх мер да другога члена парткома дырэктара банка Жардзецкага, які па-напляваўцельску адносіцца да выканання партыйных абавязкаў, не працуе над сабой.

Комуністка Паліцкая падвергла рэзкай крытыцы інструктара райкома партыі Трэспера за яго саноўна-барскія адносіны да запатрабавання радавых комуністаў. Яна расказала, пра абураючы факт, які адносіцца асабіста да яе. Зайшла аднаго разу Паліцкая ў райком да Трэспера параіцца наконт работы. Ён прапанаваў ёй пэйсці працаваць культработнікам у дом селяніна, але Паліцкая выказала думку, што гэта работа ёй не падыходзіць. Тады Трэспер даў бюракратычны адказ: «Пасады старшыні і сакратара райвыканкома ўжо заняты, а другіх вакантных пасад у горадзе няма». Пасля такога здзекваючага адказу Паліцкая забыла ў райком дарогу.

Крытыкавалі выступаючыя парочную сістэму кіраўніцтва райкома пярвічнымі арганізацыямі. Замест дапамогі сакратарам парткомаў і парторгам ў арганізацыі падрыхтоўкі і правядзення партыйных дзён райком сістэматычна рэкамендаваў ім парадак партыйных дзён, прычым рабілася гэта раптоўна, так што комуністы даведваліся аб пытаннях толькі на саміх сходах.

Р. ФРАЛОЎ.

ШУМІХА ЗАМЕСТ КРАПАТЛІВАЙ РАБОТЫ

Сакратар парткома швейнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. Канопік у сваім справаздачным дакладзе партыйнаму сходу многа гаварыў аб недахопах работы парткома. Але яго самакрытыка ў большасці насіла агульны характар. Зусім мала было канкрэтных фактаў.

З выступленняў комуністаў у справках выявілася небольшэвіцкая сістэма работы партыйнага камітэта. Галоўнае ў стылі работы парткома — шуміха замест карпатлівай увагі кожнаму члену і кандыдату партыі.

— Партком займаўся дробнай гаспадарчай апекай, падменьваў фабком,—гаворыць у сваім выступленні комуністка Гурыновіч, — гэта адрывала яго ад партыйнай работы, ад жыцця члена партыі. У арганізацыі адсутнічала крытыка таму, што партыйны камітэт ні разу не звярнуў увагі партарганізацыі на недахопы. Вострыя вуглы заўсёды абыходзіліся. Канопік сам браўся за ўсё, членам парткома баяўся даваць даручэнні, і часта на пасяджэннях парткома думка Канопіка з'яўлялася законам.

Комуністы многа гаварылі аб адсутнасці ўвагі вырашчванню і вылучэнню кадраў. Комуніста Крыгера вылучылі начальнікам цэха. У рабоце не дапамагалі. Пры выяўленні недахопаў толькі лаялі і нарэшце знялі з работы. Тое-ж самае здарылася і з вылучэннем Гурыновіч у якасці старшыні фабкома.

Парторг Фрэнклах гаворыць: «Я тры гады працую парторгам, не памятаю такога выпадку, каб сакратар парткома Канопік мяне вучыў, як працаваць. Мы, парторгі, прадастаўлены самім сабе. Калі выпадкова сакратар парткома забяжыць у цэх, ён пытаецца аб выкананні плана і ніколі не цікавіцца становішчам работы партгрупы. Стыль работы Канопіка—гэта параднасць, шуміха. Так ён і вучыў нас, парторгаў. У Канопіка ёсць моманты зазнайства, грубасці ў адносінах да комуністаў. Я, як парторг, у сваю чаргу ўспрыняла гэта непатрэбнае ад сакратара парткома і так сама паступала са сваімі комуністамі ў групе».

Нежаданне прыслухоўвацца да голасу комуністаў, адрыў ад мас—вось яшчэ чым характэрна работа парткома і яго сакратара тав. Канопіка.

Аб адсутнасці дапамогі ў рабоце гаварылі і парторгі Меламед і Бутылёў.

Комуністы адзначалі недапушчальна нячулыя адносіны парткома да асобных членаў партыі. Калі члены партыі Халяўка, Стэрн па некалькі месяцаў былі хворымі, аб іх зусім забыліся, ніхто да іх не заходзіў, не цікавіўся імі.

— Я ў гэтай арганізацыі з 1929 года,—гаворыць комуністка Чално. — У свой час я была актыўнай, працавала сакратаром партячэйкі цэха, у апошні час захварэла. 6 месяцаў да мяне ніхто не з'яўляўся, ніхто мною не цікавіўся, у выніку зараз стала пасіўнай. А пасля хваробы я цэлы месяц хадзіла прасіць работы, для мяне не маглі знайсці яе, пакуль у гэту справу не ўмяшаўся сакратар райкома т. Варончанка.

Аб адсутнасці ўвагі да чалавека, аб забыцці таго, што член партыі павінен стаяць у цэнтры ўвагі партыйнай работы гаварылі многія з выступаючых.

У сваіх выступленнях комуністы гаварылі аб дрэннай пастаноўцы партыйнай асветы. Фармальна вучобай быццам-бы ахоплены ўсе члены і кандыдаты партыі, а наведвае вельмі мала, і ніхто ў парткоме не цікавіўся прычынамі ненаведвання. Якасць вучобы зусім ніякая. За паўтары гады заняткаў ні адзін гурток па вывучэнню гісторыі партыі не скончыў праграмы.

Выключна дрэнная работа з прапагандыстамі, семінар не працуе. Культпроп райкома Чавускі ніколі не прыходзіў на фабрыку, каб дапамагчы ў арганізацыі вучобы.

Зусім слабая партыйна-палітычная работа сярод беспартыйных рабочых і служачых фабрыкі. Апрача мітынгаў і парадных сходаў нічога не праводзілася. Фармальна зацверджан спіс агітатараў у колькасці 50 чалавек, але фактычна многія лічацца агітатарамі толькі на паперы. Ніхто з работнікаў парткома не пабываў у цэху ў час гутаркі агітатара, не ўказаў яму на недахопы. Агітатары прадастаўлены самім сабе.

Комуністы Дружон, Столер, Меламед гаварылі аб тым, што за апошні час зусім не вядзецца ніякай работы са спачуваючымі, якіх налічваецца больш 80 чалавек. Ёсць спачуваючыя, якія нідзе не вучацца, не выконваюць ніякай грамадскай работы. Партком збіраў іх адзін раз у год. Яны адарваны ад жыцця партыйнай арганізацыі.

Комуністы, парторгі падвергні крытыцы і работу Кагановіцкага райкома партыі. Многія з выступаючых заяўлялі, што яны нават не ведаюць інструктара райкома, які абслугоўвае іх арганізацыю. За 1936 год,—гаворыць т. Бутылёў,—да мяне як да парторга некалькі разоў прыходзіў інструктар райкома. Прыдзе, запытае колькі комуністаў, якія пытанні абмяркоўваліся на сходах, пераглядзіць пратаколы, але ніякай дапамогі ад яго я не атрымаў.

Першы і другі дзень спрэчак паказалі, што ў партарганізацыі адсутнічала крытыка і самакрытыка, што сакратар парткома т. Канопік не прыслухоўваўся да голасу комуністаў. Усякая спроба падымаць голас крытыкі сустракала рашучы адпор.

У такой абстаноўцы развівалася падхалімства і ўгодніцтва, што, безумоўна, спрыяла рабоце класавых ворагаў.

Ц. ФРЫД.
Л. ЛЕВАНТ.

ГРУБА ПАРУШАН ПАРАДАК ВЫБАРАЎ

Прадстаўнік Кагановіцкага горрайкома КП(б)Б на сходзе партарганізацыі ВПІ груба парушыў пастанову ЦК ВКП(б) «Аб арганізацыі выбараў парторганаў». Ён няправільна растлумачыў партыйнаму сходу, хто можа быць абран у склад шчотнай камісіі. Па яго растлумачэнню атрымалася, што тыя комуністы, кандыдатуры якіх уключаны ў спіс для тайнага галасавання ў склад партыйных органаў, не маюць права быць абранымі ў склад шчотнай камісіі. Ён таксама павінен быў растлумачыць сходу, што яго як прадстаўніка горрайкома, не трэба абіраць у склад шчотнай камісіі таму, што ён на ўчоце ў гэтай партарганізацыі не састаіць. Гэтага, на жаль, прадстаўнік горрайкома т. Ціхон не зрабіў, і агульны сход абраў яго старшынёй шчотнай камісіі.

Такім чынам прадстаўнік горрайкома парушыў дырэктывы партыі аб парадку выбараў у партыйныя органы. Ф.

САКРАТАР ЗРАБІЎ ДРЭННЫ ПАЧАТАК

Нядаўна на менскім агульнагарадскім сходзе партактыва дзейнасць гарадскога совета была падвергнута суровай крытыцы. У друку таксама прыводзіліся неадзінкавыя факты аб адмоўных баках работы горсовета, у прыватнасці, факты безадказных адносін апарата горсовета да скарг працоўных. Здавалася-б, што гэтыя пытанні павінны былі знайсці пэўнае рэагаванне з боку партарганізацыі горсовета. Аднак гэтага не здарылася.

31 сакавіка партарганізацыя горсовета пачала абмеркаванне справаздачы парткома. Дакладчык, сакратар парткома т. Сакольчык, гаворачы аб усім патроху, чамусьці абмінуў вострыя вуглы. Пасля гадзіннага даклада толькі ў адказ на рэпліку т. Сакольчык зрабіў некалькі даволі павярхоўных заўваг аб тым, што становішча з рэагаваннем на скаргі па-ранейшаму нездавальняючае. Прывёўшы рад агульнавядомых прыкладаў дрэннага абслугоўвання наведвальнікаў, ён не назваў партсходу ніводнага прозвішча асоб, віноўных у гэтых справах.

Сакратар зрабіў дрэнны пачатак. Першыя выступленні ў спрэчках таксама мелі характар абязлічанай крытыкі і хутчэй нагадвалі ведамственыя прэтэнзіі (прамова т. Серабранскага аб неабходнасці дапамогі ў рабоце штабу супроць-паветранай абароны, прамова т. Грэбенчыка аб рабоце горсабеза).

І справаздача і першыя прамовы ў спрэчках, як ні дзіўна, былі значна ніжэй узроўню той крытыкі, якой падвергалася дзейнасць горсовета на сходзе партактыва.

Адзіна каштоўным было выступленне т. Нарцыс (радыёвадзел), якая на радзе канкрэтных фактаў паказала, як адказныя работнікі горсовета — комуністы (тт. Жуковіч, Саф'ян) абыякава адносяцца да выканання важнейшых даручэнняў партарганізацыі што датычыць палепшання работы апарата. Наколькі распаўсюджаны ў горсовеце вяльможныя павалкі, сведчыць факт зрыву некалькіх прыёмаў членамі президыума горсовета рабочых на прадпрыемствах горада. Нават пасля гарадскога схода партактыва, на якім аб гэтым шмат гаварылі, справа не палепшылася.

Трэба спадзявацца, што члены партыйнай арганізацыі горсовета поўным голасам скажуць аб тым, чаго не сказаў у сваім дакладзе сакратар парткома, скажуць аб прычынах марудзнай перабудовы работы партарганізацыі, скажуць аб тым, чаму апарат горсовета дагэтуль не перабудаваў сваю работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія выцякаюць са Сталінскай Канстытуцыі ў напрамку шчыльнейшай сувязі з масамі.

АЛ. ЛЕБЕДЗЕЎ.

У партыйных арганізацыях

БАБРУЙСК. Праведзены справаздачна-выбарчыя сходы ў 15 пярвічных арганізацыях. У пярвічнай партарганізацыі промарцелі «Чырвоны металіст» было парушана ўказанне ЦК ВКП(б) аб выбарах шчотнай камісіі. У шчотную камісію быў абран прадстаўнік РК КП(б)Б т. Марголін, які не знаходзіцца на ўчоце ў гэтай партарганізацыі.

Бюро Бабруйскага райкома адмяніла выбары ў гэтай партарганізацыі.

РАГАЧОЎ. У 10 пярвічных партыйных арганізацыях праведзены справаздачна-выбарчыя сходы. Комуністамі выкрыт рад фактаў нячулых адносін да комуністаў з боку кіруючых работнікаў. Таварышы крытыкавалі кіраўніцтва райкома і яго сакратароў тт. Ваймана і Таміліна якія не бывалі ў пярвічных партыйных арганізацыях горада (картонная фабрыка, райкамбінат і інш.). Комуністы крытыкавалі сакратара райкома Ваймана за грубасць і металы воклічаў на комуністаў замест растлумачэнняў і перакананняў.

ХОЙНІКІ. Адбыліся справаздачна-выбарчыя сходы ў партарганізацыях райза, райздрава і райспажыўсаюза. На сходы з'яўляліся ўсе комуністы. Па справаздачах парторгаў крытыка была вялая. Работнікаў райкома амаль не крытыкавалі, а між тым таварышы ў спрэчках вельмі многа гаварылі аб парушэнні статута, дрэннай пастаноўцы агітацыйна-масавай работы і вучобы комуністаў.

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Адбыліся справаздачна-выбарчыя сходы партарганізацый РК КП(б)Б, РВК, соўгаса Замошша і местсовета. У партарганізацыі РВК комуністы выкрылі сямейственасць, падхалімства і рад неэтычных учынкаў комуністаў, якія працуюць у РВК.

У партарганізацыі РК КП(б)Б крытыкавалі не толькі партком, але і кіраўніцтва РК КП(б)Б—сакратароў тт. Скарахода і Кліноўскага за дрэннае кіраўніцтва пярвічнымі партарганізацыямі, слабую пастаноўку партыйна-масавай работы і адрыў ад мас.

ПЛАН ДРУГОГА СТАХАНАЎСКАГА ГОДА

Сёння мы друкуем пастанову ўрада аб народна-гаспадарчым плане гэтага года *).

У лічбах, якія падводзяць вынік пройдзенага шляху і намячаюць заданні апошняга года другой пяцігодкі, кожны рабочы, служачы, калгаснік убачыць не толькі поспехі сацыялізма, але пачуе заклік да новага наступлення, да заваявання новых вышынь.

Прыняты ўрадам план — гэта закон, абавязковы для ўсёй совецкай краіны. Але партыя і ўрад не толькі намячаюць план, але і даюць у рукі яго выканаўцам тую зброю, з дапамогай якой плян можа быць ажыццёўлен: такавы стыль большэвіцкага кіраўніцтва. Гэтай зброяй з'яўляюцца дырэктывы Пленума ЦК ВКП(б) і апублікаваны ўчора даклад таварыша Сталіна на Пленуме.

Мы перавыканалі план 1936 года, не гледзячы на наяўнасць шкодніцтва германа-япона-трацкісцкіх агентаў. Выкананне планаў на працягу апошніх год атак не павінна казытаць ведамственую самалюбнасць нашых работнікаў, супакойваць іх і аслабляць іх барацьбу са шкодніцтвам. Яны павінны памятаць словы таварыша Сталіна: «даказана, што ўсе нашы гаспадарчыя планы з'яўляюцца заніжанымі, бо яны не ўлічваюць велізарных рэзерваў і магчымасцей, якія тояцца ў нетрах нашай народнай гаспадаркі».

План 1937 года, як і ўсякі план, з'яўляецца толькі абавязковым мінімумам і не можа ўлічыць і ахапіць усе магчымасці нашай гаспадаркі і нашых людзей. Слаўная совецкая традыцыя заключаецца ў тым, што прапоўныя нашай краіны лічаць доўгам свайго гонару перавыйсці і перавысіць колькасныя і якасныя заданні дзяржаўнага плана. Для такога правышэння плана ёсць усе неабходныя спрыяючыя ўмовы. Тэхніка і багатыя сыравінныя магчымасці, якія мы маем выдатныя кадры сапраўдных рэволюцыянераў вытворчасці — стахановаў, якія выраслі за апошнія гады, нарэшце нязменны ўзлём матэрыяльнага і культурнага дабрабыту мас ствараюць усе прадпасылкі для перавыканання заданага плана. Ад таго, як быстра нашы таварышы ліквідуюць вынікі варожага шкодніцтва, пакончаць з бясклопатнасцю і дабрадушнасцю, ад іх умення кіраваць, ад арганізаванасці гаспадарчых наркаматаў, ад умення разгарнуць і ўзначаліць самакрытыку мас, ад правільнага падбору людзей і іх праверкі на справе залежыць поспех другога стахановскага года.

Нельга ні на мінуту забываць аб тым, што планы 1936 года былі перавыкананы наркаматамі цяжкай лёгкай харчовай і мясцовай прамысловасці і чыгуначнага транспарту толькі ў сумарным, цэнасным выражэнні. Таварыш Сталін папярэджвае нас: «...сумарнае выкананне гаспадарчых планаў па наркаматах у цэлым яшчэ не значыць, што па некаторых вельмі важных галінах таксама выконваюцца планы. Наадварот факты гаворыць, што цэлы рад наркаматаў, выканаўшых і нават перавыканаўшых галавыя гаспадарчыя планы, сістэматычна не выконвае планаў па некаторых вельмі важных галінах народнай гаспадаркі». Заўвага таварыша Сталіна адносіцца літаральна да ўсіх наркаматаў. Гэта-ж факт, што пры сумарным выкананні плана Наркомцяжпромам такія важнейшыя галіны, як каменнавугальная, нафтавая прамысловасць, каляровая металургія і асобныя абаронныя заводы, з планам не справіліся. У Наркомлегпроме не выканала заданняў ільняная прамысловасць. У Наркомхарчпроме не выканалі плана цукровапясочная, плодагародная, маслабойная і маргарынавая прамысловасць. План чыгуначных перавозак быў перакрыт, а ў той-жа час НКШЗ не выканаў задання па нагрузцы такога важнейшага груза, як вугаль. Ёсць далей цэлыя наркаматы, якія не выканалі мінулагоднага плана. Такавы Наркомвод, Наркомлес.

Краіна не можа цярпець адставання работнікаў лясной прамысловасці, якое цягнецца ўжо некалькі год. Краіна, якая вядзе будаўніцтва ў небывалых маштабах, не можа мірыцца з прадаўжаючымся адставанем будаўнічай індустрыі. Краіна не можа цярпець далей ганебнага адставання рачнога транспарту, які яўляе сабой некультурны прыклад арганізацыйнай слабасці кіраўніцтва і нізкай працоўнай дысцыпліны.

Яшчэ не зжыты барска-пагардлівыя адносіны да совецкага рубля, што сказалася ў невыкананні заданняў па зніжэнню сабекошту. Нізка дагаворная дысцыпліна, і гэтым зрываецца вытворчае казнерыраванне прадпрыемстваў. Надзвычай слаба барацьба за павышэнне якасці вырабаў.

Самасупакоенасць і зазнайства нашых гаспадарнікаў аблягчылі япона-нямецка-трацкісцкім шпіёнам іх варожую руйнуючую работу і дазволілі ворагу нанесці нямалую страту развіццю народнай гаспадаркі. Не падлягае сумненню, што пры лепшай арганізацыі нашай работы, пры больш высокім узроўні палітычнай пільнасці мы маглі-б дабіцца значна больш буйных поспехаў. Недахопы гаспадарчага кіраўніцтва ва што-б там ні стала павінны быць выкаранены ў сёлетнім годзе. 1937 год — 20-ты год Вялікай пролетарскай рэволюцыі — павінен увайсці ў гісторыю сацыялістычнага будаўніцтва як год перамог на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва, як год перамагання адставання ва ўсіх галінах нашай работы. Не будзе адстаючых наркаматаў, галін, заводаў! — так павінны алказаць работнікі прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі на рашэнні Пленума ЦК ВКП(б).

Праграма дана. Справа зараз у тэмпах яе ажыццяўлення, у стылі работы.

Праходзіць ужо трэці месяц 1937 года, і трэба прызнаць, што вынікі неўпяшальныя. Яны ўнушаюць трывогу. У студзені—люты—сакавіку планавыя заданні не выконваюцца. Наўрад ці каго-небудзь могуць супакоіць гнілыя, неаднаразова бітыя спасыланні на аб'ектыўныя прычыны, на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы ў пачатку года. Сапраўдная прычына — ў яшчэ моцна жывучых настроях зазнайства, слабасці штодзённага гаспадарчага кіраўніцтва, у нязжытых яшчэ надзеях на наступныя штурмы, і ілжывым перакананні, быццам выкананне плана вырашаецца напружанасцю работы ў апошнія месяцы года. Усыпляючы сябе ўсялякімі апраўданнямі і надзеямі на будучыню, некаторыя гаспадарнікі не заўважаюць таго, як паступова нарастае іх доўг перад краінай. Гэтым парушаецца ўжо асноўная ўмова нармальнай работы без рыўкоў, без «штурмаў». Такое становішча далей нецярпіма. Пара пакласці прадзел накапленню гэтага доўгу. Пара пакончыць з усякімі сезоннымі спадамі вытворчасці.

Нездавальняюча ідзе веснавая сяўба. Раннее наступленне вясны засцігла многіх партыйных і совецкіх работнікаў знянацку. Трэба напомніць, што паспяховае правядзенне веснавой сяўбы, а затым уборкі ўраджаю з'яўляецца важнейшай часткай выканання народна-гаспадарчага плана. Многім здавалася, што дасягнутае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў знімае з павесткі дня барацьбу за выкананне планаў у сельскай гаспадарцы, што справа пойдзе самацёкам. Іменна бяспечнасць і стаўка на самацёк сказаліся на пачатку сяўбы. З гэтым трэба канчаць. Аб'ём прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ўсё больш узрастае, задачы ўскладняюцца. Гэта патрабуе ўзмацнення большэвіцкага кіраўніцтва, узмацнення барацьбы за план.

Велізарная праграма 1937 года можа быць і будзе з поспехам выканана, калі яна будзе ў цэнтры ўвагі совецкіх, партыйных і прафесіянальных органаў. Яе пераможнае ажыццяўленне павінна быць забяспечана велізарнай палітычнай работай у масах, павышэннем пільнасці і актыўнасці партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў. Трэба цвёрда помніць словы таварыша Сталіна аб тым, «што самі гаспадарчыя поспехі, іх трываласць і працягласць цалкам і поўнасцю залежаць ад поспехаў партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы, што без гэтай умовы гаспадарчыя поспехі могуць аказацца пабудаванымі на пяску».

Праграма дана. Возьмемся-ж па-баявому за справу Выкаранім недахопы, будзем працаваць па-новаму. Ліквідуем вынікі шкодніцтва, забяспечым выкананне і перавыкананне плана дванцатага года Вялікай пролетарскай рэволюцыі!

(Перадавы артыкул «Правды» ад 30 сакавіка).

*) Пастанова ўрада аб народна-гаспадарчым плане надрукавана ў газ. «Звязда» ад 1 красавіка.

ЗА ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ НІХТО НЕ АДКАЗВАЕ

У гэтым годзе калгасы БССР павінны засеяць гатунковым насеннем 457.900 гектараў. Беларуская кантора заготзярно (кіраўнік Чудноўскі) і кантора дзяржсортфонда (кіраўнік Мартэнсон), якія павінны абмяняць калгасам 135.90 тысяч цэнтнераў чыстагатунковага насення, не надалі гэтаму важнейшаму мерапрыемству неабходнага значэння. Яны ў сваёй рабоце абмежаваліся толькі тым, што спусцілі планы сваім базам, паведамілі раённым выканаўчым камітетам і палічылі, што іх работа на гэтым закончана.

У сваю чаргу многія кіраўнікі раённых арганізацый і ў першую чаргу райвыканкомаў і райза наследавалі прыкладу Чудноўскага і Мартэнсона. Усю работу па абмену насення прадаставілі самацёку.

Габінетнае кіраўніцтва Чудноўскага і Мартэнсона пытаннямі абмену насення прывяло да таго, што на 25 сакавіка па сістэме Белзаготзярно план абмену гатунковага насення выканан на 42,1 проц., па дзяржсортфонду — на 68,6 проц.

Такія раёны, як Дрыбінскі, Ветрынскі, Чавускі план абмену гатунковага насення выканалі ад 1,6 да 3,5 проц. Старшыні гэтых райвыканкомаў тт. Клімаў, Харытоненка і Гурыч раней не мабілізавалі калгасы на своечасовую вывазку насення са складаў, а зараз усю віну ўскладаюць на дрэнную дарогу.

Ці могуць у Лагойскім і Кармянскім раёнах сур'ёзна гаварыць аб социялістычным спаборніцтве за высокі ўраджай, калі да 25 сакавіка калгасы не пачыналі абменьваць насення.

Усё гэта гаворыць аб тым, што Белзаготзярно не адчувае адказнасці, якую нясе за веснавую сяўбу. Нават зараз работнікі Беларускай канторы заготзярно праяўляюць паўнейшае самасупакоенне. Намеснік упаўнаважанага тав. Гітцовіч заяўляе, што зараз усё пойдзе як па маслу, што ў раёны выехалі людзі. Асабліва дрэнна, — гаворыць Гітцовіч, — была ў нас справа з абменам насення ў раёнах Горацкім і Дрыбінскім. На базе насенне не пачышчалася і падводы кожны дзень варочаліся паражняком.

Нават і зараз, калі кіраўнікі Беларускай канторы заготзярно ўбачылі лічную пагрозу, не праяўляюць асаблівай трывогі.

Не лепшае становішча і з абменам гатунковага насення па лініі дзяржсортфонда.

Зараз, калі абменена толькі 68,6 проц., дырэктар канторы тов. Мартэнсон пачаў «націскаць» тэлеграмамі, у якіх катэгарычна папярэджвае, што калі на працягу 5 дзён не выберуць насення, то апошняе будзе перакінута з другі раён. Такога зместу тэлеграма была, напрыклад, паслана старшыні Талачынскага райвыканкома тав. Конікаву.

4 сакавіка Конікаў тэлеграфіраваў у Беларускую кантору дзяржсортфонда, што план абмену будзе выканан на працягу 5 дзён. Застрахаваўшыся гэтай тэлеграмай, у раёне спынілі далейшыя клопаты аб насенні. Прайшло больш 20 дзён, а Талачынскі раён па абмену насення не мае ніякіх зрухаў. На 25 сакавіка было абменена толькі 32,7 проц. насення.

Не адчуваюць адказнасці за гатунковым пасевы і работнікі Наркомзема БССР. Насенавод зерневога кіраўніцтва тав. Загарэльскі ўсю віну за зрыў абмену перакладвае на Беларускую кантору заготзярно, што яна ва ўсім вінаўна. Што канкрэтнага зроблена, каб выцравіць ганебнае адставанне з абменам насення, тав. Загорэльскі не мог адказаць. Наркомзем БССР толькі і ведае, што складае зводкі, якія з пяцідзённі ў пяцідзённку фіксіруюць недапушчальнае адставанне рэспублікі ў падрыхтоўцы гатунковага насення да сяўбы.

Д. МАЛЕВІЧ
А. ЛОСЬ.

На ўсебеларускай нарадзе стаханаўцаў—перадавікоў сельскай гаспадаркі. НА ЗДЫМКУ: удзельнікі нарады ў зале пасяджэнняў Дома ўрада.
Фото Лупейка (БСФ).

НА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ СТАХАНАУЦАУ—ПЕРАДАВІКОУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Учора на ранішнім пасяджанні ўсебеларускай нарады стаханаўцаў ураджайнасці і перадавікоў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы працягваліся выступленні делегатаў. Старшыні калгасаў і сельсветаў, калгасныя брыгадзіры ўскрывалі недахопы ў падрыхтоўцы да сяўбы, крытыкавалі работу асобных раённых зямельных аддзелаў, райвыканкомаў і райкомаў партый, Наркомзема БССР, якія самаўхіліліся ад кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, пусцілі падрыхтоўку да сяўбы на самацёк.

Выступае старшыня калгаса імя Кірава Грэскага раёна тав. Аляшэвіч.

— З падрыхтоўкай да сяўбы тут яшчэ не ўсё добра,—кажа ён,—слаба вывозіцца гной і торф. Як-жа дапамагаюць калгасу раённыя арганізацыі, каб выправіць недахопы? Тав. Аляшэвіч скардзіцца, што ў калгас ніхто не заязджае. Грэскі райземаддзел (загадчык т. Калежка) толькі складае планы, а штодзённае кіраўніцтва адсутнічае. Планы гэтыя, складзеныя габінетным парадкам, у большасці не задзейнічаюць павышэнцю ўраджайнасці. Кожны год замаюцца севазабароты, не стымулюецца рост жывёлагадоўлі. Наркомзем (тав. Венек), як указвае выступаючы, даводзіць планы, не ўлічваючы асаблівасцей калгасаў. Тав. Аляшэвіч указвае далей, на тое, што райземаддзел (загадчык Калежка) не любіць самакрытыкі. З прычыны заціску самакрытыкі не выкрываюцца недахопы райземаддзела, які дрэнна кіруе калгасамі, стаіць ў баку ад падрыхтоўкі да сяўбы.

Тав. Урэцкі—старшыня калгаса «Чырвоны араты» Лельчыцкага раёна—ў сваім выступленні адзначае, што цэнтральныя арганізацыі спазніліся са скліканнем данай нарады.

— Кіраўніцтва нашага райземаддзела, — кажа тав. Урэцкі, — нікудышнае. Спецыялісты з райземаддзела толькі пішуць паперкі, а сяўбой не цікавяцца. У выніку зрываецца абмен насення, вывазка мінеральнага і загатоўка мясцовага ўгнаення.

— Лельчыцкі райземаддзел (загадчык тав. Чарвякоў) не клапоціцца аб забеспячэнні калгасаў насеннем. Старшыня райвыканкома тав. Харлап за тры гады ні аднаго разу не быў у калгасе «Чырвоны араты». Тут няма севазабароту, не праведзена поўнае землеўпарадкаванне. Тав. Урэцкі прапануе, каб СНК БССР і Наркомзем заняліся пытаннем землеўпарадкавання і ўвядзення севазабаротаў у самы бліжэйшы час.

Крытыкаваў работу раённых арганізацый і Наркомзема старшыня калгаса «Піонер» Копыльскага раёна тав. Наўмовіч. Ён указаў, што Копыльскі райземаддзел (загадчык тав. Яцкевіч) не ведае становішча ў яго калгасе, даводзіць толькі планы і на гэтым самасупакойваецца. Планы-ж гэтыя не дазваляюць калгасу ўвесці севазабарот. Тут вымушаны сеяць з года ў год на адным участку адну і тую-ж культуру, што паніжае ўраджай. Райземаддзел звальвае віну на Наркомзем, а севазабароту ў калгасе і зараз няма.

Аграномы райземаддзела прыязджаюць у калгас толькі для збора лічбаў, якімі апелююць перад раённымі арганізацыямі. Няма таго вышэйшу, каб агранам пагаварыў з калгаснікам. Пасланыя ў райземаддзел экспанаты для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі згублены аграномамі. Тав. Наўмовіч расказвае, што ў раёне пануе падхалімства, якое даводзіць да ідыёцкай хваробы—бясклопатнасці, самасупакоенасці раённых арганізацый. І гэта ў той час, як падрыхтоўка да сяўбы ў раёне праходзіць нездавальняюча.

Аб рабоце сельскіх советаў, іх кіраўніцтве сяўбой гаворыць тав. Усовіч — старшыня сельсовета з Чырвона-Слабодскага раёна.

— Сельскія советы, — кажа ён, — не працуюць са стаханаўцамі, а звяртаюцца да іх толькі ў выпадку якой-небудзь урачыстасці. Ніхто не дапамагае звесным стаханаўцаў у барацьбе за ўраджай. Аграномы райземаддзела і МТС не бываюць у калгасе. Тав. Усовіч патрабуе ад Наркомзема БССР звярнуць больш увагі кіраўніцтву калгасамі, а таксама і райземаддзелам, увесці севазабароты ва ўсе калгасы.

Ордэнаносец—старшыня калгаса «Чырвоны гай», Рагачоўскага раёна тав. Цалікаў, расказваючы аб поспехах у барацьбе за ўраджай, ставіць пытанне аб лепшай арганізацыі пратручвання насення, ачысткі і падрыхтоўкі яго да сяўбы. У іх сельсавеце ёсць толькі адзін трыер. Колькі ні звярталіся да раённых арганізацый, ніхто не аказаў дапамогі. Аграномы не кіруюць пратручваннем насення, іх няма на палях, калі патрэбна ўстанавіць сеялку. Ніхто таксама не займаецца насеннымі ўчасткамі, яны існуюць фармальна. І тут Наркомзем БССР не даў патрэбнага ўказання, як лепш арганізаваць насенную справу ў калгасах.

Прадстаўнік делегацыі Заходняй вобласці — ордэнаносец тав. Фралоў указаў на недахопы ў спаборніцтве БССР з Заходняй вобласцю. Кожны год заключаецца дагавор, але яго ніхто не правярае. Тав. Фралоў ставіць пытанне аб арганізацыі сапраўднага, большэвіцкага социялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай 1937 года.

На ранішнім пасяджэнні таксама выступіў старшыня Запольскага сельсовета, Клічаўскага раёна тав. Маршалоў, які крытыкаваў гастралёрскае кіраўніцтва раённых арганізацый калгасамі. Таксама выступалі старшыня калгаса імя Молатава Рэчыцкага раёна т. Верамейчык і старшыня калгаса «Новае жыццё» Слуцкага раёна тав. Гурбо.

У перапынку пасяджэння делегаты з вялікай увагай калектыўна слухалі перадачу па радыё заключнага слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б) 5 сакавіка 1937 года.

На вячэрнім пасяджэнні старшыня Стралішчанскага сельсовета Бешанковіцкага раёна тав. Базылёў у сваім выступленні падверг суровай крытыцы работу зямельных раённых органаў. Кіраўнікі райза і МТС,—гаворыць тав. Базылёў,—калі і бываюць у калгасе, то толькі гутараць з старшынёю калгаса. У сваёй рабоце я таксама рабіў многа промахаў. Старшыня калгаса «Іскра» парушаў сталінскі статут і я гэта ў свой час не дагледзеў.

Тав. Нікалаенка з Расонскага раёна гаворыць, што нізкі ўраджай калгасаў Клясцінкага сельсовета і іншых атрымоўваецца толькі таму, што няма севазабаротаў, а прыходзіцца сеяць культуру па культуры, што Наркомзем пытаннямі севазабаротаў не займаецца.

Усяго на вячэрнім пасяджэнні выступіла 8 делегатаў. Сёння у 11 гадзін выступленні працягваюцца.

ЗАБЫТЫ ПУНКТ СТАТУТА ПАРТЫІ

У 55 пункце статута ВКП(б) сказана: На ўсіх з'ездах, нарадах і ў выбарных органах пазапартыйных совецкіх, прафесіянальных, кааператыўных і т. п. масавых арганізацый, дзе ёсць не менш 3 членаў партыі, арганізуюцца партыйныя групы, задачай якіх з'яўляецца ўсебаковае ўзмацненне ўплыву партыі і правядзенне яе палітыкі ў пазапартыйным асяроддзі, умацаванне жалезнай партыйнай і совецкай дысцыпліны, барацьба з бюракратызмам, праверка выканання партыйных і совецкіх дырэктыў».

Такім чынам, статут партыі з усёй чоткасцю вызначае ролю і задачы партыйных груп і гаворыць аб значэнні іх у справе забеспячэння партыйнага кіраўніцтва масавымі арганізацыямі, як «вагарамі» сістэмы дыктатуры рабочага класа ў нашай краіне.

Але страта асобнымі партыйнымі работнікамі густу да партыйна-палітычнай работы і адназабаковае захапленне гаспадарчымі пытаннямі, аб чым гаворыць гістарычны лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б), сказаліся і на кіраўніцтве масавымі арганізацыямі. Райкомы партыі часта замест палітычнага кіраўніцтва сельсветамі, профсаюзамі і кааперацыяй праз партыйныя групы падмяняюць апошнія і становяцца на шлях адміністравання або дробнай гаспадарчай апекі над выбарнымі органамі пазапартыйных арганізацый.

Яркім прыкладам гэтага можа служыць Магілеўскі райком КП(б)Б, які, па нашаму, не з'яўляецца вялікім выключэннем у адносінах да іншых райкомаў.

Праверкай упаўнаважанага КПК устаноўлена, што Магілеўскі райком КП(б)Б зусім забыў аб 55 параграфе статута партыі. У результаце гэтага партгрупы ў беспартыйных выбарных арганізацыях у Магілеве, будучы прадастаўлены самім сабе, або зусім не працавалі, або займаліся не ўласцівымі ім функцыямі.

Так, напрыклад, партгрупа райсовета Асоавіяхіма зусім не была афармлена на працягу звыш паўгода пасля выбараў райсовета. Партгрупы горсовета, райпрофсовета, райсаюза і іншыя райкомам партыі ніколі не запрыгаджаліся і за ўвесь час іх існавання райком не праверыў і не заслухаў на сваім пасяджанні ні адной партыйнай групы. У райкоме нават адсутнічае ўчот партгруп і асобныя работнікі райкома змешваюць іх з цэхавымі партгрупамі на прадпрыемствах.

Чым-жа, пры такім «кіраўніцтве» з боку райкома партыі, займаліся партгрупы? Прыводзім, як узор, партгрупу райвыканкома. За ўвесь 1935 год партгрупа ГВК засядала ўсяго тры разы і ўсё па арганізацыйных. У пачатку 1936 года сакратаром групы т. Плаўнікам быў складзен план работы на першы квартал года, але ні адзін пункт з гэтага плана за ўвесь год не быў выканан. На далейшых сваіх пасяджаннях партгрупа займалася разборам толькі такіх пытанняў, як «аб водпуску т. Чыжу» (пасяджанне групы ад 28 кастрычніка 1936 года), «аб водпуску начальніку раміліцыі і выплаце росшчы ў зарплаце» (29 лістапада 1936 г.), «аб пасылцы на лячэнне т. Вайсмана» (9 студзеня 1937 г.), «аб аказанні лячэбнай дапамогі т. Госіну» (17 студзеня 1937 г.) і т. п.

Як відаць з вышэйпрыведзенага пераліку пытанняў, разабраных групай, пытанні социялістычнага будаўніцтва ў раёне праходзілі міма партыйнай групы Магілеўскага райвыканкома. Не дзіўна пасля таго, калі ў становішчы сельскай гаспадаркі ў раёне, у рабоце школ і на іншых участках ёсць рад сур'ёзных прарываў, якіх райком і райвыканком не «адчуваюць», што палітмасавая работа ў радзе сельсветаў адсутнічае; гэта сям-там не без поспеху выкарыстоўваў класавы вораг (Вендарожскі сельсовет, Княжыцкі сельсовет).

Райком партыі замест штодзённага палітычнага кіраўніцтва советамі праз партгрупу райвыканкома (сам не займаючыся сур'ёзна пытаннямі палітычнай работы на сяле) часта падмяняў райвыканком, выносячы адміністратыўнага характару рашэнні па пытаннях спагнання плацяжоў і сельгаспаставак.

Як прыклад, можна прывесці наступную пастанову бюро Магілеўскага райкома КП(б)Б ад 23 снежня 1936 года:

«Бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Катэгарычна папярэдзіць усіх старшынь і парторгаў сельсветаў і калгасаў, што яны нясуць адказнасць за поўнае выкананне плана мясапаставак па ўсіх сектарах у сельсавеце нароўні з Заготжывёлай.

2. Абавязаць усіх старшынь сельсветаў зрабіць суцэльную праверку ўсіх здатчыкаў мяса і да злосных ужываць законныя меры ўдзейнічання...

4. Абавязаць усіх старшынь сельсветаў прыняць рашучыя меры па ўзысканню мясапаставак ад кожнага аднаасобніка і калгасніка на працягу бягучай пяцідзённі...

6. Даручыць т. Будовічу справу аб злосных здатчыках мяса тэрмінова расследаваць і вінаўных прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

7. Абавязаць т. Філіповіча на працягу трох дзён накіраваць у сельсветы «пісьмы ўсіх нядоімшчыкаў—аднаасобнікаў і калгаснікаў».

У астатніх пунктах гэтага рашэння таксама абавязваюцца асобныя людзі і папярэджваюцца старшыні сельсветаў, што калі яны на працягу некалькіх дзён план не выканаюць, «бюро РК КП(б)Б вымушана будзе ўжыць да іх суровыя меры спагнання». Каментарыі да гэтага рашэння лішні.

Пасля гэтага не дзіўна, што райком партыі не знайшоў часу абмеркаваць пытанне аб палітмасавай рабоце на сяле, аб рабоце калгасных і сельсоветскіх первічных арганізацый і нават, без абмеркавання на бюро РК, ліквідаваў у IV квартале 1936 года первічныя арганізацыі ў калгасах «Прамень прабуджэння», «Комінтэрн», «Чырвоны спяг», «Пераменнік» і ў Дабрасневіцкім сельсавеце.

Больш сур'ёзнымі пытаннямі займалася партгрупа магілеўскага горсовета, але і яна прайшла міма галоўнага — праверкі ажыццяўлення рашэнняў партыі і ўрада. А райком у той час займаўся тэксама дробязямі гаспадарчай работы горсовета. Напрыклад, 15 верасня 1936 года на пасяджанні бюро райкома слухалася пытанне аб «рамонце памяшкання пад магазін № 15 Белпромгандля, займаемага гр. Хаймовым, і перасялення гр. Хаймова» і вынесена пастанова рашэнне: «абязаць т. Смелькепсона на працягу дэкады аслабаніць (?) памяшканне займаемае ў сучасны момант гр. Хаймовым, і адрамантаваць яго для магазіна № 15 Белпромгандля». Да рэчы, не лішне было-б райкому ўжо заадно сказаць у гэтым рашэнні і пару законных слоў—якім шляхам «аслабаніць» і куды дзявацца гр. Хаймову?

Падобнымі пытаннямі райком займаў не адзін раз свае пасяджанні. Сакратар РК т. Клімчук знайшоў час абмеркаваць на бюро РК пытанне аб рамонце рэстарана, рамонце гасцініцы, кіно, аб прадастаўленні кватэр асобным грамадзянам і т. д., але ён не знайшоў часу паслухаць аб тым, як працуе партгрупа горсовета ў масах, як выконваюцца наказы выбаршчыкаў, захоўваецца совецкая дэмакратыя і інш. больш важныя пытанні, пытанні партыйнай работы.

Калі мы возьмем партгрупы выбарных органаў у іншых арганізацыях (райсаюз, міжрайскурпромсаюз і інш.) то яны таксама нічога не робяць і не ведаюць, што ім рабіць, бо сакратары груп, відаць, у статут партыі рэдка заглядваюць, а райком іх ні разу не інструктаваў.

У тых арганізацыях, дзе сакратар парткома або парторг первічнай партарганізацыі пабайчэй, там ён, у меру сваіх здольнасцяў, падмяняе сабой партгрупу выбарнага органа (райсаюз), але затое ўпускае задачу выхавання членаў партыі і іншыя пытанні сваёй непасрэднай работы. А дзе гэтага няма, там група зусім не працуе і старшыня «адзінаначальнае ажыццяўляе парткіраўніцтва арганізацыяй. Але паколькі гэта ўжо ўстаноўлена, гаспадарнік займаецца палітычнымі пытаннямі менш, чым партработнікі, то палітычным зместам работы арганізацыі сістэматычна ніхто — ні група, ні райком не займаюцца.

Адным з прыкладаў безадказных адносін асобных парторгаў да кіраўніцтва партгрупамі ў пазапартыйных арганізацыях з'яўляецца становішча ў партгрупе ЦК «Чырвонага крыжа» у Менску. Апошні час сакратаром гэтай партыйнай групы быў і праводзіў пасяджанні беспартыйны член ЦК гэтай арганізацыі.

Старшынёй ЦК «Чырвонага крыжа» з'яўляецца т. Любовіч (старшыня Дзяржплана), але ён ніякага ўдзелу ў рабоце арганізацыі не прымае і, відавочна, лічыць, што ён сваім прозвішчам у спісах ЦК «Чырвонага крыжа» налае ёй больш гонару. Трэба адказваць перад партыйнай арганізацыяй за сваю работу, а гаркому трэба паглядзець, што-ж робіцца ў партыйных групах масавых арганізацый у Менску.

Зараз, калі ЦК ВКП(б) з усёй большэвіцкай рашучасцю паставіў перад партыйнымі арганізацыямі задачу ўзмацнення партыйна-палітычнай работы ў масах, гаркомы і райкомы КП(б)Б не могуць праходзіць міма пытання карэннага паляпшэння і перабудовы работы партыйных груп у выбарных органах советаў, профсаюзаў, кааперацыі і іншых масавых арганізацый. Гэтага асабліва патрабуе задача перабудовы работы ўсіх арганізацый у сувязі з увядзеннем новай Сталінскай Канстытуцыі.

Д. ШУПІКАЎ.

АКАДЭМІК В. В. ШКАТЭЛАЎ

(Да 50-годдзя навуковай дзейнасці)

Акадэмія навук Беларускай рэспублікі і ўся навукова-педагагічная грамадскасць адзначаюць 50-гадовы юбілей аднаго са старэйшых вучоных нашай краіны акадэміка Уладзіміра Віктаравіча Шкатэлава.

Папулярнасць В. В. Шкатэлава звязана з заснаваннем новай галіны прамысловасці ў Саюзе па здабычы жывіцы і перапрацоўцы яе ў каніфоль і шкіпідар.

Пяцьдзесят год свайго жыцця ён прысвяціў беспарэчнынай упартай рабоце па вывучэнню падсочнай справы і складу смаляных (каніфольных) кіслот, арганізаваў і кіраваў навукова-даследчай работай у гэтай галіне.

В. В. Шкатэлаў нарадзіўся 7 мая 1861 года ў сям'і дробнага чыноўніка ведамства фінансаў. У 9-гадовым узросце ён трапіць свайго бацьку і пры дапамозе мацеры заканчвае 7 класаў класічнай гімназіі. Паступіў у 1878 годзе па асобнаму экзамену ў Маскоўскае тэхнічнае вучылішча, заканчвае яго паспяхова па хімічнаму аддзяленню ў 1884 годзе са званнем інжынера-тэхнолага і ўзнагароджан асобным значком.

9 лістапада 1886 года В. В. Шкатэлаў абіраецца асістэнтам Петроўска-Разумоўскай сельскагаспадарчай Акадэміі, дзе займаецца сельскагаспадарчай і лясной тэхналогіяй. У далейшым яго рэкамендуюць на пасаду прафесара па кафедры агульнай сельскагаспадарчай тэхналогіі Нова-Александрыйскага сельскагаспадарчага інстытута.

Пасля друкавання і абароны дысертацыі «Аб хімічным складзе смол» 10 снежня 1889 года Совет Тэхнічнага вучылішча надаў В. В. Шкатэлаву рэдкую для таго часу годнасць «вучонага інжынера-тэхнолага».

У рабоце «Аб хімічным складзе смол» В. В. Шкатэлаў адначасова з вывучэннем прыроды смол, іх складу і злучэнняў, даказваў магчымасць атрымліваць жывіцу з нашай сасны і здабываць каніфоль і шкіпідар, не ўступаючы французскай каніфолі і шкіпідару. Гэта работа звярнула ўвагу вялікага хіміка Д. І. Мендэлеева, які асабіста перадаў В. В. Шкатэлаву, што ён гэту работу чытаў і змест яе ўхваляе.

Не гледзячы на 25-гадовае даследванне, падрабязнае і глыбокае вывучэнне складу падсочных прадуктаў з нашай сасны і не гледзячы на падтрымку такога вялікага аўтарытэта як Д. М. Мендэлееў, царскі ўрад не лічыў патрэбным унядрыць у вытворчасць шматгадовыя працы В. В. Шкатэлава. У інтарэсах царскага ўрада і рускай буржуазіі было даказваць, што французскі шкіпідар, французская, амерыканская каніфоль з'яўляюцца найлепшымі прадуктамі і што падобных прадуктаў з нашай сасны атрымаць нельга.

Толькі пасля вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі вынікі шматгадовай творчай дзейнасці В. В. Шкатэлава знайшлі не толькі ўсеагульнае прызнанне, але і шырокае ўнядрэнне з заснаваннем значнай галіны прамысловасці па падсочцы і атрыманню каніфолі і шкіпідару з жывіцы нашай сасны. Праглядаючы жыццёвы шлях В. В. Шкатэлава, нельга не заўважыць, што з 50-гадовай творчай дзейнасці апошнія 15—20 год характэрны вялікім уздымам творчай ініцыятывы і работы, характэрны каштоўнымі работамі для нашай социялістычнай прамысловасці.

Яшчэ ў час грамадзянскай вайны совецкі ўрад звяртае ўвагу на В. В. Шкатэлава і ў сувязі з 25-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці за каштоўныя навуковыя работы надае яму годнасць заслужанага прафесара.

У 1923 годзе В. В. Шкатэлаў пераязджае з Украіны (дзе ён працаваў з 1914 па 1923 год) у БССР. Грамадскасць і ўрад БССР зварачваюць увагу на работу В. В. Шкатэлава і ў 1929 годзе ён зацвярджаецца сапраўдным членам Акадэміі навук БССР і прызначаецца дырэктарам інстытута хіміі, якім кіруе да прыезду ў г. Гомель.

На тэрыторыі БССР у сучасным Асіпавіцкім лесгасе ўтвараюцца першыя доследы падсочкі ў СССР у вопытна-вытворчых умовах (1925 год). Але знайшліся яшчэ кансерватыўныя людзі б. лясного кіраўніцтва, якія ставілі перашкоды ў пастаноўцы вопытных работ Шкатэлава. Яны адпусцілі яму сродкі ўзаемаабразна. На гэтыя сродкі В. В. арганізаваў работу, сам кіраваў і праводзіў работу на падсочцы, сам зладжыў печ і ўстанавіў кацёл па перапрацоўцы жывіцы. Было здабыта 3113 кгр. жывіцы, з якой атрымана 2190 кгр. каніфолі і 576 кгр. шкіпідару, рэалізацыя якіх дала магчымасць вярнуць атрыманыя сродкі са значным прыбыткам. Магутнае развіццё і індустрыялізацыя нашай радзімы патрабавалі вялікай колькасці каніфолі і шкіпідару, што развіла і пашырыла здабычу жывіцы шляхам падсочкі нашай сасны.

З моманта здабычы В. В. Шкатэлавым трох тон жывіцы прайшло толькі 10—11 г. а здабыча жывіцы ўзрасла ў некалькі сотень разоў. Беларускі трэст Белхімлес у 1936 годзе здабыў ужо 7112 тон, а па ўсяму СССР здабыта 90—100 тысяч тон жывіцы. Замест маленькай, выкладзенай самім Шкатэлавым печкі з катлом у Асіпавіцкім лесгасе, у сучасны момант у СССР працуюць больш двух дзесяткаў добра абсталяваных заводаў па перапрацоўцы жывіцы ў каніфоль і шкіпідар. Даўно ўжо краіна перастала прывозіць амерыканскую каніфоль і французскі шкіпідар. Нашы папяровыя фабрыкі, мылаварныя заводы, хімічныя заводы карыстаюцца каніфоллю і шкіпідарам, атрыманымі з нашай сасны, з нашых заводаў, і ў гэтым вялікая доля шматгадовай упартай работы сапраўднага патрыёта нашай социялістычнай радзімы акадэміка В. В. Шкатэлава.

З 1925 года юбіляр арганізуе навукова-даследчую работу ў БССР, дзе дасканальна вывучаюцца розныя спосабы падсочкі, уплыў падсочкі на прырост і тэхнічныя ўласцівасці драўніны. Па вывучэнню хімічнай прыроды каніфолі, смаляных кіслот, іх злучэнняў лабараторыя В. В. Шкатэлава карыстаецца ўсеагульным прызнаннем.

В. В. Шкатэлаў першы даказаў магчымасць шляхам абяссмольвання атрымаць запалкавую саломку з сасны. Распрацаван спосаб скарыстання адгонных вод каніфольна-шкіпідарных заводаў з атрыманнем эфірных эсенцый. Падрыхтаван да ўнядрэння спосаб перапрацоўкі жывіцы без пара, ажыццяўленне якога ўнясе палую рэвалюцыю ў каніфольна-шкіпідарную прамысловасць.

Немагчыма пералічыць усе работы акадэміка В. В. Шкатэлава, бо дзейнасць яго не абмяжоўваецца толькі ў леса-хімічным напрамку. За час сваёй дзейнасці ён пабудаваў тры газавыя заводы, дзе прымяніў свой арыгінальны спосаб газапровадаў і кіравання ўсім тэхналагічным працэсам здабывання газа. Адным з пабудаваных ім заводаў і ў сучасны момант карыстаецца Беларускі універсітэт. Вось ужо скора 13 год, як бесперапынна завод забяспечвае газам лабараторыі універсітэта.

Работы па сінтэзу феналаў, па цукровай вытворчасці, халадзільнай справе, шчавелевай кіслаце, атрыманню ёда і брома з крымскіх водарасляў, даследванню нафты, здабыванню соды, прыгатаўленню вінаградных він, матэматычныя даследванні і інш. — гаворыць аб тым, што ў асобе В. В. Шкатэлава мы маем дзеяча з шырокай эрудыцыяй, з многагранай дзейнасцю, што характэрна для многіх вялікіх вучоных нашай радзімы.

За 50 год педагагічнай работы многа тысяч маладых спецыялістаў слухалі яго захапляючыя лекцыі, якія заўсёды ён дэманстраваў доследамі, арыгінальна ім падрыхтаванымі і пастаўленымі.

Многа ёсць у БССР спецыялістаў — агрономаў і лесаводаў, якія слухалі яго лекцыі і прапрацоўвалі з ім тэхналогію лясных і сельскагаспадарчых прадуктаў.

У складзе Акадэміі навук БССР арганізаван і працуе пад кіраўніцтвам акадэміка Шкатэлава, з дапамогай яго выхаваны, моцны калектыў навуковых работнікаў.

Многія вучні юбіляра выраслі ў буйных спецыялістаў лесахімічнай прамысловасці. Пры акадэміку В. В. Шкатэлаве выраслі моладзь — навуковыя кадры з беларускіх рабочых і сялян.

Уладзімір Віктаравіч з асаблівай упартасцю і насляджоўнасцю праводзіў і праводзіць цеснае яднанне тэорыі з практыкай. Няма ў яго работ, якія-б не мелі прымянення ў вытворчасці, разам з гэтым і не былі-б высокаякаснымі з тэарэтычнага боку. Упарта працягваць пачатую работу, улічваючы і выпраўляючы недахопы — гэтай уласцівасці могуць і павінны вучыцца ў В. В. маладыя даследчыкі лесахімічнай справы ў СССР. Як асаблівасць характару В. В. Шкатэлава трэба адзначыць яго непрыязнь да ўсякага роду самарэклам, высоўвання сваіх асабістых пераваг. Уладзімір Віктаравіч з'яўляецца прыкладам вучонага, які заслугоўвае вялікай пашаны — за метады сваёй работы, падыход да навуковых праблем, увязку іх з практыкай, за асаблівую ўвагу да маладых работнікаў, якім ён дае максімальную творчую свабоду, за выключную навуковую добрасумленнасць і скромнасць.

Не гледзячы на свае 76 год, В. В. Шкатэлаў не перастае і цяпер навукова працаваць і сам асабіста з працаўнікамі праводзіць доследы ў лабараторыі і выязджае ўнядраць вынікі работы на завод. Выступаючы на сесіі Акадэміі, юбіляр указаў, што ён стаў вядомым, таму што шматгадовае жыццё дало магчымасць дажыць да пролетарскай рэвалюцыі, да вялікай эпохі Леніна—Сталіна, у якой творчая адданая работа падтрымліваецца і пашыраецца, у якой для людзей навукі партыя і ўрад забяспечылі найлепшыя ўмовы, у якой лепшым другам навукі з'яўляецца найвялікшы чалавек эпохі таварыш Сталін.

Пажадаем Уладзіміру Віктаравічу шмат год працаваць з той-жа прапаздольнасцю, настойлівасцю і прадукцыйнасцю творчай работы і дасягнуць яшчэ большых вынікаў на карысць нашай шчаслівай вялікай социялістычнай радзімы.

А. СКРЫГАН.
(Камітэт хімічных навук Акадэміі навук БССР).

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Наступленне рэспубліканцаў на фронце Гвадалахары

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае паведамленне камітэта абароны Мадрыда, апублікаванае ў поўдзень:

Пасля заняцця вёскі Міральрыо на фронце Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) рэспубліканцы ўзялі з боем рад пазіцый праціўніка, якія маюць вялікае стратэгічнае значэнне і пануюць над франтавой лініяй праціўніка каля Саелісео. Гэта аперацыя рэспубліканскіх войск была падтрымана некалькімі рэспубліканскімі эскадрыллямі, бесперапынна бамбардыравалі шымі тыл мяцежнікаў ля граніцы правінцыі Гвадалахара — Сарагоса.

Рэспубліканскія артылерыя і авіяцыя бамбардыравалі пазіцыі мяцежнікаў у правінцыі Авіла (на паўночны захад ад Мадрыда).

***

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), 31 сакавіка. (БЕЛТА). На сантандэрскім фронце (Сантандэр—порт на беразе Біскайскага заліва) ўрадавыя войскі працяжваюць пачатае ўчора наступленне. У сектары Лос-Мартыхэ Элінэс (на паўднёвы ўсход ад Рэйноса) урадавымі войскамі занята ўзвышша Лора, якое з'яўляецца ключом для далейшага прасоўвання на Бургос. На ўчастку Очанхыяно (на поўнач ад Вільяраль) разведчы атрад рэспубліканцаў пранік у тыл праціўніка, дзе захапіў шмат ваенных матэрыялаў і па глухіх сцежках непрыкметна для мяцежнікаў без страт вярнуўся на свае пазіцыі.

ПАРЫЖ, 1 красавіка. (БЕЛТА). У правінцыі Бургос (паўночны фронт) рэспубліканцы занялі рад вёсак, у тым ліку вёску Сархентэс, якая мае вялікае стратэгічнае значэнне. Увогуле рэспубліканцы прасунуліся на 20 км.

***

ПАРЫЖ, 1 красавіка. (БЕЛТА). Ва ўчарашнім вячэрнім паведамленні камітэта абароны Мадрыда гаворыцца, што ў раёне Гвадалахары рэспубліканцы некалькі прасунуліся. Вёска Леданка, пакінутая ўпёкшымі мяцежнікамі, была занята рэспубліканцамі. Захвачана каля 10 кулямётаў, аўтаматычныя вінтоўкі, шмат працівагазаў і скрынкі з боепрыпасамі і гранатамі.

***

ПАРЫЖ, 1 красавіка. (БЕЛТА). Учора ўвечары рэспубліканцы знаходзіліся за 23 кіламетры на паўднёвы захад ад Пасабланка (на фронце Кардовы). Рэспубліканскія войскі занялі вёску Эльсольвадо і прасунуліся яшчэ на 8 кіламетраў. У руках рэспубліканцаў чыгунка Пасабланка—Бельмес.

У апошнія два дні ў часе свайго наступлення рэспубліканцы захапілі 380 вінтовак, 300 тыс. патронаў, 100 працівагазаў. Рэспубліканцы выявілі на сваім шляху шмат трупаў італьянскіх, германскіх і марыканскіх салдат. Сярод забітых не аказалася ні аднаго іспанца.

Умовы, забяспечваючыя перамогу

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Камуністычны друк апублікаваў вытрымкі з пратакола насяджання палітбюро іспанскай кампартыі.

У пратаколе гаворыцца, што палітбюро, разглядзеўшы новую сітуацыю, якая склалася ў выніку апошніх баёў на гвадалахарскім і паўднёвым франтах, адзначае, што ў гэтых аперацыях выявілася боездольнасць народнай арміі, якая адкрывае перспектывы пэўнай перамогі над ворагам.

Трэба чакаць, што айчыны і замежны фашызм прадпрыме адчайную спробу контрнаступлення, пры якім увядзе ў кіру ўсе свае рэсурсы. З прычыны гэтага праблема хуткага стварэння буйных рэзерваў патрабуе максімальнай увагі з боку ўрада.

«Улічваючы становішча, якое стварэнна ўстанаўленнем кантролю над нашымі берагамі і граніцамі, палітбюро яшчэ раз падкрэслівае неабходнасць максімальна хуткага пуску ў ход магутнай абаронай прамысловасці, здольнай задаволіць патрэбы нашай арміі, а таксама неабходнасць узмацнення кіраўніцтва работай гэтай прамысловасці аж да непасрэднага ня важнейшых галін»,—гаворыцца ў пратаколе.

Палітбюро паставіла перад урадам пытанне аб неабходнасці стварэння органа, здольнага ў найкарацейшы тэрмін наладзіць работу абароннай прамысловасці.

Палітбюро лічыць неабходным яшчэ больш умацаваць адзінства ўсіх антыфашыстаў, адзінства іспанскага народа, як неабходнейшую ўмову далейшых поспехаў рэспубліканскай зброі, якія павінны знайсці сваё вышэйшае выражэнне ў хуткай і канчатковай перамозе над фашызмам.

Новая змова супроць Франко

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе аб раскрыцці змовы супроць генерала Франко ў Іспанскім Марока. Змоўшчыкі мелі намер выступіць 3 красавіка, заняць памяшканне вярхоўнага камісара ў Тэтуане, галоўныя будынкі ў Тэтуане, Ларачэ, Сеуце і іншых гарадах Іспанскага Марока. У сувязі са змовай арыштавана 1.150 чалавек.

Як перадае агенцтва Брытыш юнайтэд прэс, у Тэтуан нібыта прыехаў Франко.

Фашысцкія піраты затрымліваюць французскія і англійскія параходы

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што ўчора раніцой у адкрытым моры суды іспанскіх мяцежнікаў затрымалі французкі параход «Кап Фалькон», які ішоў з Алжыра (паўночная Афрыка) з грузам зярна і він. Мяцежнікі далі выстрал па французскаму параходу і прымусілі яго спыніцца. Толькі пасля пратэсту капітана «Кап Фалькон» мяцежнікі дазволілі параходу прадаўжаць свой рэйс.

***

ЛОНДАН, 30 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, камандуючаму англійскімі сіламі ў Міжземным моры дана інструкцыя заявіць уладам іспанскіх мяцежнікаў пратэст супроць затрымання суднамі мяцежнікаў трох англійскіх параходаў.

ЦЫНІЧНАЯ АДКРАВЕНАСЦЬ ФАШЫСЦКАГА ДРУКУ

БЕРЛІН, 31 сакавіка. (Ул. кар. «Праўды»). Германскі друк з адкрытым задавальненнем канстатуе «ясность і супакаенне», наступіўшыя ў пытанні аб італьянскіх «добраахвотніках» у Іспаніі. «Дэйчэ альгемейне цэйтунг» у яўна здзекваючым тоне піша:

«За вялікодныя дні парыжскае хвалявання не ў сувязі з пытаннем аб добраахвотніках зноў узляглося, на гэты раз па камандзе з Лондана. Англія ўсё-ж палічыла неабходным пакласці французам на рану пластыр. У адным паведамленні агенцтва Гавас з Лондана гаворыцца, што ў выпадку пасылкі новых добраахвотнікаў Англія будзе лічыць становішча вельмі сур'ёзным і ўжыве ўсе меры, якія акажуцца неабходнымі».

Фашысцкая газета яўна не баіцца гэтай «пагрозы» і робіць з чарговага праяўлення ўступчывасці наступны зусім адкрыты і цынічны вывад:

«Важна наступае: Англія лічыць, што такога становішча яшчэ няма (г. зн. становішча, пры якім павінны быць прыняты меры) бо прабыванне ўжо знаходзячыхся ў Іспаніі італьянскіх добраахвотнікаў, само сабой зразумела, не азначае парушэння лонданскай згоды».

НА ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Учора пад старшынствам прэзідэнта рэспублікі Лебрэна адбылося пасяджэнне совета міністраў.

У дакладзе аб міжнародным становішчы міністр замежных спраў Дэльбос заявіў, што сістэма кантролю на сухапутных і морскіх граніцах Іспаніі поўнасцю ўступіць у сілу праз некалькі дзён.

Перагаворы па пытанню аб адкліканні добраахвотнікаў, якія прымаюць удзел у грамадзянскай вайне ў Іспаніі, будуць адноўлены ў бліжэйшы час.

Спыніўшыся на нядаўніх інцыдэнтах паміж караблямі мяцежнікаў і замежнымі суднамі, Дэльбос указаў, што французскаму флоту былі даны інструкцыі і што французкі ўрад, як і англійскі, зрабіў сур'ёзнае папярэджанне абодвум бакам у Іспаніі, патрабуючы, каб яны «устрымаліся ад якіх-небудзь дзеянняў, якія пярэчаць морскаму праву».

Затым совет міністраў прыняў рад дэкретаў, якія прадугледжваюць устанаўленне 40-гадзіннага рабочага тыдня ў папяровай прамысловасці, у магазінах для разрыбнага гандлю (апрача гандлю прадуктамі харчавання), у банках і страхавых таварыствах, а таксама для рабочых і служачых ашчадных кас.

Карныя экспедыцыі супроць абісінскіх партызан

РЫМ (сталіца Італіі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Апублікавана афіцыяльнае паведамленне, з якога відаць, што італьянскі віцэ-кароль у Абісініі Грацыяні атрымаў у час нядаўняга замаху некалькі дзесяткаў ран і што ў адплату рэпрэсій былі падпалены пасёлкі туземцаў. У гэтай сувязі цікава адзначыць карэспанденцыю з Абісініі, якая з'явілася ў газеце «Папола д'Італія».

«У гарах раёна Амара, — піша газета, — хаваюцца атрады разбойнікаў... У раёне Бале таксама ёсць узброеныя атрады абісінцаў, але яны акружаны... Раён Шоа з'яўляецца найбольш неспакойным... 300 забітых, 400 раненых паўстанцаў — вось вынікі бліскучых дзеянняў генерала Гаці, які правёў экспедыцыю ў раёне Серфімар'ям.

Усеагульная забастоўка на шанхайскіх шаўковых фабрыках

ШАНХАЙ (буйнейшы цэнтр Кітая), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамленню газет, сёння рабочыя 130 шаўковых фабрык Шанхая аб'явілі ўсеагульную забастоўку, ахапіўшую звыш 15 тыс. рабочых. Рабочыя патрабуюць павышэння зарплаты на 20—30 проц., скарачэння рабочага дня да 10 гадзін і паляпшэння абыходжання з рабочымі.

„ДЭЙЛІ УОРКЕР" АБ ДАКЛАДЗЕ таварыша СТАЛІНА НА ПЛЕНУМЕ ЦК ВКП(б)

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Цэнтральны орган англійскай кампартыі «Дэйлі Уоркер» у перадавым артыкуле адзначае, што даклад таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б) прадстаўляе сабой дакумент выключнага значэння для ўсяго міжнароднага рабочага класа.

«Дадзены Сталіным праніклівы аналіз,—піша газета,—важнейшых асаблівасцей становішча Совецкага Саюза ў адносінах да капіталістычнага свету і сталінская характарыстыка контрэволюцыйнай ролі трацкізма, як агента фашысцкіх і імперыялістычных падпальшчыкаў вайны, прадстаўляюць сабой бліскучае прымяненне прынцыпаў марксізма-ленінізма».

Даклад таварыша Сталіна, піша ў заключэнне газета, трэба чытаць, вывучаць і зрабіць здабыткам рабочых мас.

КАНФЛІКТ ПАМІЖ ЯПОНСКІМ ПАРЛАМЕНТАМ І УРАДАМ

ТОКІО (сталіца Японіі), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Бяспрыкладны роспуск ніжняй палаты, паследаўшы за некалькі гадзін да закрыцця парламенцкай сесіі, паводле ацэнкі палітычных колаў, не з'яўляецца нечаканым. Японскі друк яшчэ нядаўна ўказваў на грозныя адзнакі разыходжанняў паміж палітычнымі партыямі і ўрадам і прадказваў магчымасць узнікнення буйна-палітычнага крызіса, як толькі парламенцкая сесія будзе закончана. Перагаворы аб пагадненні, аб кампрамісе не далі вынікаў. Урад, які ўжо забяспечыў прыняцце бюджэта на 1937—1938 год, па прапанове морскага міністра Іонай, падтрыманай ваенным міністрам Сугіяма, сёння прыняў рашэнне аб роспуску ніжняй палаты, (парламента) ажыццявіўшы, такім чынам, з некаторым спазненнем высунутае былым ваенным міністрам Тэраўці патрабаванне аб нанясенні ўдару палітычным партыям.

Сёння з мотаю растлумачэння прычын роспуску палаты апублікавана дэкларацыя ўрада Хаясі. У дэкларацыі гаворыцца, што ўрад з самага пачатку праяўляў поўную шчырасць у адносінах да парламента, прыкладаў усе намаганні да правядзення розных законаў, аднак становішча ў ніжняй палаце ў сувязі з абмеркаваннем раду важнейшых мерапрыемстваў перашкаджала ўрад у тым, што ніжняя палата пазбаўлена шчырасці. Палата байкатавала абмеркаванне многіх важных мерапрыемстваў, шчыльнейшым чынам звязаных з дзяржаўнай абаронай народнага жыцця. Урад, — гаворыцца ў дэкларацыі, — схілен сумняваецца ў шчырасці ніжняй палаты, у поўным разуменні ёю перажываемага Японіяй пяжкага становішча. Адсюль зусім абгрунтавана з дня ў дзень высоўваюцца патрабаванні аб тэрміновай рэформе парламента. Таму ўрад рашыў прыняць меры да роспуска ніжняй палаты.

***

ТОКІО, 31 сакавіка. (БЕЛТА). Усе палітычныя партыі, прадстаўленыя ў ніжняй палаце японскага парламента, адгукнуліся заявамі на роспуск палаты. Агенцтва Домей Пусік указвае, што партыі Мінсейто і Сейюкай (асноўныя буржуазнапамешчыцкія партыі ў парламенце) катэгарычна абвяргаюць абвінавачванне іх з боку ўрада ў няшчырасці.

Партыя Сякай тэйсюто (сацыял-дэмакратычная партыя, якая мае 18 месц у парламенце) указвае, што слабы ўрад Хаясі таксама не можа справіцца з перажываемым Японіяй пяжкім становішчам і выказвае ўпэўненасць, што яна, атрымаўшы вялікую перамогу на надыходзячых выбарах, «здолее зламаць у парламенце ўплыў старых буржуазных партый».

2 красавіка спаўняецца 50-гадовы юбілей навуковай дзейнасці старэйшага лесахіміка, кіраўніка лесахімічнай лабараторыі навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі БССР акадэміка В. В. Шкатэлава. НА ЗДЫМКУ (у цэнтры): акад. В. В. Шкатэлаў са сваімі вучнямі навуковымі работнікамі інстытута ў лабараторыі.

Фото С. Грына.

ПАШЫРЭННЕ РЫБНЫХ БАГАЦЦЯЎ БССР

Як толькі ў вімавальных прудах 6 рыбгасаў БССР патрэсціла вада да 4—6 градусаў, з іх пачнецца перасадка гадавалага карпа ў нагульныя пруды для таго, каб да восені бягучага года атрымаць з яго таварнай прадукцыі ў колькасці 4,5 тысяч цэнтнераў. Усяго па рыбгасах будзе перасаджана 1.771 тыс. гадавалых карпаў, сярэдняй вагой 25—30 грамаў. Да восені яны вырастуць да 450—500 і больш грамаў.

Мінулагодняя практыка правядзення ўтнаення некаторых выраслых прудоў суперфасфатам і вапнай дала павышэнне прадукцыі да 163 проц. У гэтым годзе Бедрыбтрэст намеціў правесці ўтнаенне і нагульных прудоў, што ў сярэднім дасць павышэнне прадукцыі на 30 проц. У мінулым годзе на плошчы 15 гектараў прудавых гаспадарак праводзілася падкормка карпа лубінам. Гэта павысіла прадукцыйнасць прудоў у 2,5 раза. У гэтым годзе падкормку карпа намечана праводзіць на плошчы 135 гектараў у чатырох рыбгасах.

Упершыню ў гэтым годзе рыбгасы пачнуць забяспечваць пасадачным матэрыялам уноўарганізаючыяся калгасныя і саўгасныя прудавыя гаспадаркі. Для калгасных прудавых гаспадарак намечана адпусціць 50—60 тыс. штук гадавалых карпаў. 150 тыс. штук гадавалых карпаў будзе выпушчана для нагула ў азёры, у якіх папярэдне вылавіцца дранежная рыба (шчука). У гэтым годзе спецыяльна прыстасавана для нагула карпа возера Судзіболь, Смалявіцкага раёна.

Па прыкладу мінулага года рыбучасткі будуць праводзіць штучнае асеменнене ляшча. Для гэтай мэты будзе выпушчана ў ваду 150 мільёнаў ікрынак ляшча. У мэтах акліматызацыі ў іншых мясцовых водаёмах будзе праведзена перасадка 30 тыс. ракаў. У гэтых-жа мэтах будзе праведзена перасадка 250 штук вытворнікаў судака і 500 штук вытворнікаў ляшча.

НОВЫЯ КАЛГАСНЫЯ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

У радзе раёнаў БССР прыступлена да падрыхтоўчых работ па будаўніцтву новых калгасных гідраэлектрастанцый на дробных роках. СНК БССР запвердзіў планы іх будаўніцтва. У бягучым годзе будзе пабудавана звыш дзесятка такіх станцый. Яны дадуць электрычнае святло 7.800 калгасным дамам і забяспечаць электраэнергіяй гаспадарчыя патрэбы не менш 30 калгасаў. Турбіны для гэтых гідраэлектрастанцый зробіць бабруйскі завод імя Сталіна. Адкрываюцца спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы электраманцёраў для малазагутных калгасных гідраэлектрастанцый. На іх будаўніцтва асігнавана 1.280 тыс. руб.

ПІЛЬНАСЦЬ ПАРАВОЗНАЙ БРЫГАДЫ

29 сакавіка поезд № 1410 пад кіраўніцтвам машыніста-комсамольца Каспюковіча, памочніка машыніста Анікіенка і качагара Смольскага па прыбыцці на ст. Барысаў быў прынят на заняты шлях. Крушэнне .было немінуча. Толькі дзякуючы асобай пільнасці і растаропнасці Каспюковіча і Анікіенкі катастрофа была папярэджана.

З-за закруглення шляху паравозная брыгада ўбачыла наперадзе сталчы на ст. Барысаў таварны поезд № 964 толькі на адлегласці 200—250 метраў. Ужыўшы тэрміновае тармажэнне, пусціўшы ў ход пясочніцу і контрпар, Каспюковіч спыніў свой поезд на адлегласці 50 метраў ад пярэдніх вагонаў сустрэчнага поезда. Паравозная брыгада прадстаўлена да ўзнагароды.

ПАПРАЎКА

У заключным слове таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б), апублікаваным ва ўчарашніх газетах, у трэцім абзацы шостага пункта надрукавана:

«Гэта значыць, па-першае, што мы, кіраўнікі, не павінны зазнавацца, не павінны думаць, што, калі мы з'яўляемся членамі ЦК ці наркомамі, то гэта яшчэ не значыць, што мы маем усе неабходныя веды для таго, каб правільна кіраваць. Чыя сам па сабе не дае ведаў і вопыту. Званне—тым больш».

Трэба чытаць:

«Гэта значыць, па-першае, што мы, кіраўнікі, не павінны зазнавацца і павінны разумець, што, калі мы з'яўляемся членамі ЦК ці наркомамі, то гэта яшчэ не значыць, што мы маем усе веды, неабходныя для таго, каб правільна кіраваць. Чыя сам па сабе не дае ведаў і вопыту. Званне—тым больш».

ШАХМАТНЫЯ НАВІНЫ

* У Менску закончыўся школьны шахматна-шашачны куставы турнір 8 раёнаў, у якім прымалі ўдзел 25 школьнікаў — пераможцаў раённых турніраў. У шахматным турніры першае месца заняў вучань барысаўскай 10-годкі Левін. У шашачным турніры першае месца заняў Хейфец (Барысаў).

* Учора адбыўся другі тур вузаўскага каманднага пяршынства па шахматах і шашках. Педінстытут выйграў у БДУ, політэхнічны інстытут выйграў у інстытута народнай гаспадаркі.

* Цэнтральны совет профсаюзаў Беларусі атрымаў выклік ад Украінскага совета профсаюзаў на матч па шахматах і шашках паміж зборнымі камандамі профсаюзаў Беларусі і Украіны.

НЯПРОШАНЫ ВАГОНАВАЖАТЫ

Было гэта 21 студзеня. Бычкоўскі А. І., пражываючы ў горадзе Віцебску, вышаў і параплыў павесяліцца. Зайшоўшы ў трамвайны вагон № 35, які ішоў па маршруту № 4 па вуліцы Волі (Віцебск) і, карыстаючыся адсутнасцю ў вагоне як вагонаважатага, так і кандуктара, пусціў вагон, а сам скрыўся.

Пасажыры перапоўненага вагона заўважылі, што вагон ідзе без вагонаважатага. Пачалася паніка. Некаторыя на поўным ходу пачалі саскакваць. Аднак ён быў астаноўлен гр. Бейліным, які знаходзіўся ў вагоне і ведаў тэхніку спынення вагона. І толькі дзякуючы гэтай вынаходлівасці крушэнне вагона было прадухілена, і афіяр не здарылася.

Судовая калегія Вярхоўнага суда БССР ў горадзе Віцебску пад старшынствам тав. Волдырэва прыгаварыла хулігана Бычкоўскага да 3 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР.

І. МІН.

ЗДАРЭННІ

◎ **Машэнніцтва.** Грамадзянка Таргонская Ю. А., пражываючая ў Менску па вуліцы Апанскага, дом 64-2, парашыла атрымаць дапамогу па шматсямейнасці. Добра не думаючы, Таргонская рашыла машэнніцкім шляхам атрымаць гэтыя грошы, прадставіўшы метрыку не дзіцяці, памёршага яшчэ ў 1934 г., і атрымала 2.000 рублёў.

Крымінальным вышукам 4-га аддзялення міліцыі машэнніцтва Таргонскай выкрыта. Яна прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

АД БАГУШЭЎСКАГА РК КП(б)Б

Згублены партыйны білет узору 1936 года, выданы Багушэўскім РК КП(б)Б на імя члена партыі Паўленка Александра Мітрафанавіча за № 0859523, лічыць несапраўдным.

Сакратар Багушэўскага РК КП(б)Б МЕЖУЕЎ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

У ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1).
2 красавіка
ПЛАТОН КРЭЧЭТ
Абанем. № 72

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
ОПЕРЫ І БАЛЕТА
2 красавіка
ЕЎГЕНІЙ ОНЕГІН
Абанемент № 5.

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ТРОЕ З АДНОЙ ВУЛІЦЫ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗОРЫ ПАРЫЖА
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ: 5, 7, 9 і 11 гадзін веч.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ВАРОЖЫЯ СЦЕЖКІ

Гукавы кінотэатр «СПАРТАК»
АНТЭК ПАЛІЦМЕЙСТАР

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 2 КРАСАВІКА:
16.30 — тэкст заключнага слова таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б)
23.30—тэкст заключнага слова таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б) на польскай мове.

ДА ВЕДАМА ТРЫМАЛЬНІКАЎ АБЛІГАЦЫЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК!

У 1937 ГОДЗЕ па пазыцы Другой пяцігодкі (выпуск чацвертага года) будзе праведзена

ПЯЦЬ ТЫРАЖОЎ ВЫЙГРЫШАЎ

Першы тыраж адбудзецца 25 МАЯ гэтага года ў г. Маскве, другі тыраж— 25 ЧЭРВЕНЯ

АБ МЕСЦЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ДРУГОГА ТЫРАЖУ І ТЭРМІНАХ НАСТУПНЫХ ТЫРАЖОЎ БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЕНА ДАДАТКОВА.

1. У РОЗЫГРЫШЫ БУДУЦЬ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ ТОЛЬКІ ТРЫМАЛЬНІКІ, АБМЯНЯЎШЫЯ АБЛІГАЦЫІ СТАРЫХ ПАЗЫК.

2. РАЗДАЧА АБЛІГАЦЫЙ ПА ПАДПІСЦЫ 1936 ГОДА БУДЗЕ ПРАВЕДЗЕНА АДНАЧАСОВА З ВЫДАЧАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ ЗА ДРУГУЮ ПАЛОВУ КРАСАВІКА.

3. ТРЫМАЛЬНІКІ ДЗЯРЖПАЗЫК, ЯКІЯ ЗДАЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАД ССУДЫ І НЕ ПАГАСЯЦЬ ССУДЫ ДА ПАЧАТКУ ТЫРАЖУ, ПАЗБАВЛЯЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ТЫРАЖАХ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ЗАКЛАДЗЕНЫХ ІМІ АБЛІГАЦЫЯХ ДЗЯРЖПАЗЫК.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА БЕЛКААПСАЮЗА

1 красавіка 1937 г. № 177 г. Менск.

АБ ТАВАРНЫХ РАЗЛІКАХ З ПРАДАЎЦАМІ ХЛЕБА

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 31 сакавіка 1937 г. № 658, прэзідыум Белкаапсаюза пастанаўляе:

1. Устанавіць гранічны тэрмін дзейнасці хлебазакупачных квіткоў на набыццё тавараў: 25 красавіка 1937 г. для квіткоў, выданых да 21 сакавіка 1937 г., і месячны тэрмін для квіткоў, выданых пасля 21 сакавіка 1937 г. апрача тавараў, паказаных у арт. 2 гэтай пастановы.

2. Устанавіць, што пасля заканчэння тэрмінаў, паказаных у арт. 1 гэтай пастановы, квіткі трацяць сілу на атрыманне тавараў, за выключэннем праданых па дагаварах аўтамашын, сельгасмашын, нафтаруховікоў, ботаў на скуранай падэшве, якія тавары павінны быць атрыманы калгасамі ў месячны тэрмін з дня паведамлення аб паступленні гэтых тавараў.

3. Абавязаць старшынь акрайспажыўсаюзаў шырока абвяшчаць калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам, прадаўшым дзяржаве хлеб урджаю 1936 г., праз мясцовы друк, аб'явы, вывешаныя ва ўсіх крамах, сельсоветах і калгасах, аб устаноўленых гэтай пастановай тэрмінах дзейнасці хлебазакупачных квіткоў, папярэдзіўшы трымальнікаў квіткоў аб тым, што пасля паказанага тэрміну яны трацяць права на атрыманне тавараў за пранаданы дзяржаве хлеб апроч тавараў, паказаных у арт. 2 гэтай пастановы.

4. Абавязаць старшынь акрайспажыўсаюзаў сумесна з акрайвыканкомамі і райзаў паскорыць арганізацыю размеркавання калгасамі паміж калгаснікамі часткі хлебазакупачных квіткоў для набыцця тавараў (у тым ліку тавараў вытворчага назначэння) непасрэдна калгаснікамі.

5. Прапанаваць пад асабістую адказнасць старшынь акрайспажыўсаюзаў забяспечыць поўнасцю і своечасова таварныя разлікі з усімі прадаўцамі хлеба атрыманымі і занараджанымі таварамі, а таксама тавараміі, якія падлягаюць пераключэнню, звярнуўшы асаблівую ўвагу на перакідку ў неабходных выпадках лішніх тавараў хлебазакупачнага фонда з аднаго сельпо ў другое, арганізаваўшы абавязковыя выезды раймагаў, сельмагаў і сельпо з тавараміі хлебазакупачнага фонда ў калгасы.

6. Абавязаць старшынь акрайспажыўсаюзаў забяспечыць суцэльную праверку становішча атаварвання калгасаў і абавязкова афармляць адпаведнымі актамі канчатковыя разлікі з калгасамі.

7. У сувязі з маючымися фактамі разбазарвання ў асобных раёнах тавараў хлебазакупачнага фонда, прэзідыум Белкаапсаюза абавязвае асабіста старшынь акаперацыйных арганізацый забяспечыць рэалізацыю тавараў хлебазакупачнага фонда выключна па прамому прызначэнню, праводзячы рашучую барацьбу з фактамі разбазарвання тавараў хлебнага фонда.

8. Абавязаць акрайспажыўсаюзы дасланць хлебагандлёвай канторы не пазней 5 мая 1937 г. акты аб канчатковых разліках з калгасамі на атаварванню.

Старшыня Прэзідыума Белкаапсаюза КАРАЛЕВІЧ.

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—2054. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. К. К. С.